ВЫДАННЕ АСВЕТНІКАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

газета НАСТАЎНІЦКАЯ

Выходзіць з 20 снежня 1945 года

№ 141 (5323)
Субота, 8 снежня 2001 года
Кошт у розніцу — 84 руб.

Актуальна

Як стварыць ідэальны падручнік?

"Ахілесава пята" сучаснага падручніка, у прыватнасці падручніка па гісторыі, - логіка пабудовы зместу мадэлі вучэбнага прадмета. Ці ў стане мы сёння зрабіць сур'ёзны крок у вырашэнні праблемы падручніка? Пра гэта размова з галоўным рэдактарам навукова-метадычнага часопіса "Гісторыя: праблемы выкладання" М.І.Мініцкім.

— Мікалай Іосіфавіч, вы з'яўляецеся галоўным рэдактарам часопіса "Гісторыя: праблемы выкладання", які ўжо пяць гадоў служыць справе гістарычнай адукацыі. Якую б праблему вы вылучылі ў гэтай сферы і чаму?

— Сярод розных адукацыйных праблем я б выдзеліў праблему падручніка. Яна факусіруе пытанні набыцця ведаў і інтэлекту, выхавання грамадзяніна і патрыёта, фарміравання духоўнага аблічча маладога чалавека. Сёння праблема падручніка гучыць асабліва актуальна. У апошнія гады, бадай, не было ніводнага адукацыйнага мерапрыемства, на якім бы не ішла гаворка пра аптымальныя шляхі яе вырашэння. Апошняе таму сведчанне – II з'езд настаўнікаў Рэспублікі Беларусь.

— Няўжо праблема падручніка настолькі драматычная? Мы ж маем і пэўныя поспехі: абнаўляецца змястоўная парадыгма, уводзяцца новыя адукацыйныя тэхналогіі, выпускаюцца нацыянальныя падручнікі.

— Адназначна адказаць на гэтае пытанне нельга. Без сумнення, практыка стварэння падручнікаў мае пазітыўныя бакі. У нашай рэспубліцы ўпершыню вырашаецца задача стварэння нацыянальных падручнікаў. Вось некалькі прыкладаў. Гэта значна ўдасканаленыя падручнікі "Мая Радзіма – Беларусь" (3 клас), сацыяльна-гуманітарны курс "Чалавек і свет (Гуманістыка)" (8–11 класы), падручнік па сусветнай гісторыі (8 клас). Неабходна адзначыць і сумарны факт: за апошнія пяць гадоў у рэспубліцы было выпушчана звыш 900 найменняў нацыянальных падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў. Разам з тым, агульнымі недахопамі вучэбнай літаратуры з'яўляюцца: перавышэнне дапушчальных аб'ёмаў, высокая ступень складанасці, ігнараванне тыпаў здольнасцей вучняў, сур'ёзныя недапрацоўкі ў афармленні кніг.

— Якія перспектывы вырашэння гэтых пытанняў? Што, на вашу думку, можна вырашыць у бліжэйшы час?

— Адно з самых слабых месцаў у стварэнні вучэбнай літаратуры – логіка пабудовы змястоўнай мадэлі вучэбнага прадмета. Мадэль павінна мець інтэгратыўны характар. І таму неабходна яе ўсебаковая тэарэтычная распрацоўка педагогамі, гісторыкамі, псіхолагамі, метадыстамі. Акрамя таго, трэба ўлічыць логіку самога тэксту. Гэта шлях вырашэння многіх, але не ўсіх, пытанняў. У непасрэднай сувязі з гэтым можна згадаць рэкамендацыю вядомага расійскага вучонага і арганізатара навукі, філосафа І.С.Ладэнкі. Ён лічыў, што для вырашэння адукацыйных праблем важна наяўнасць трох рэчаў: калектыву зацікаўленых прафесіяналаў, тэхналогіі і сродкаў. У якасці зыходных момантаў нам неабходна цяпер лабараторыя тэхналогій падручніка, дзе былі б сканцэнтраваны навуковыя і практычныя намаганні. Яе стварэнне магчыма на базе Рэспубліканскага навукова-метадычнага цэнтра вучэбнай кнігі, дзе ёсць блізкія па профілі лабараторыі.

Што датычыць тэхналогій, то з імі – парадаксальная сітуацыя. З аднаго боку, мы маем сур'ёзныя недахопы ў пытанні стварэння падручнікаў, з другога, ёсць шэраг перадумоў для хуткага вырашэння гэтай праблемы. Такія пытанні, як аб'ём і складанасць вучэбнага тэксту ды інш., можна паспяхова вырашыць ужо цяпер на аснове тэхналогій, распрацаваных пераважна ў 80–я гады мінулага стагоддзя. А сучасныя камп'ютэрныя тэхналогіі на аснове псіхалінгвістыкі дазваляюць улічваць узроўні і тыпы здольнасцей вучняў.

— Рэарганізацыя, і асабліва новыя тэхналогіі, патрабуюць значных фінансавых сродкаў.

— І гэтую праблему можна вырашыць, толькі падыходзіць да яе трэба з сучасных пазіцый. Фінансаванне арганізацыйнага боку справы ў першы час можа ажыццяўляцца за кошт перагляду рэзерву ўнутры НМЦ вучэбнай кнігі.

З сучаснымі камп'ютэрнымі тэхналогіямі сітуацыя больш складаная. Яны ёсць на расійскім рынку, але цана іх даволі высокая. Мы маглі б звярнуцца і да беларускіх распрацовак, але яны не настолькі дасканалыя. Таму патрабуюцца час і зноў жа сродкі, хаця і значна меншыя. Грошы ў хуткім часе мы зможам зарабляць і самі.

Тут неабходна прынцыпова новае рашэнне – стварэнне камерцыйнай арганізацыі, непасрэдна звязанай з рынкам рэкламы. Дарэчы, гэта прынесла б прамую карысць і рэкламе. Справа ў тым, што сучасныя тэхналогіі апрацоўкі тэксту могуць выкарыстоўвацца ў любой камунікатыўнай сферы: у рэкламе – псіхалагічнае ўздзеянне на спажыўца; у адукацыі – стварэнне падручнікаў з улікам розных, у тым ліку і індывідуальных, патрэб вучняў; у сродках масавай інфармацыі – фарміраванне грамадскай думкі; у дызайне – стварэнне пэўных псіхалагічных установак і эмацыянальнага настрою. Такім чынам, зацікаўленых асоб тут можа быць дастаткова шмат.

Яшчэ адна крыніца – спонсарства, або вядомае з пачатку XX стагоддзя мецэнацтва. Выданню падручнікаў маглі б у першую чаргу дапамагчы кнігавыдавецкія фірмы. Напрыклад, у афармленні падручнікаў – фірма "Белфакс", выданні якой звяртаюць на сябе ўвагу не толькі на беларускім, але і на расійскім рынку. А ім маглі б быць карыснымі парады вучоных па тэхналогіях тэксту, такія магчымасці і патрэбы ёсць у абодвух бакоў.

— Не маглі б вы спраектаваць мадэль "Ідэальнага" падручніка па гісторыі для будучыні? Як ён павінен выглядаць?

— Падручнік па гісторыі перш за ўсё павінен быць прыгожым, цікавым і даступным. Ён павінен несці ў сабе не толькі пэўную "суму" ведаў, але і спосабы пазнавальных дзеянняў. Прычым апошняму фактару надаецца цяпер усё большае значэнне. Плынь інфармацыі, у тым ліку і вучэбнай, аб'ектыўна павялічваецца. Значыць, актуальнай становіцца навуковая распрацоўка спосабаў упарадкавання, захоўвання і выкарыстання ведаў, а таксама навучанне гэтаму вучняў.

— На вашу думку, ці дастаткова намаганняў вучоных-гісторыкаў і педагогаў-метадыстаў, каб напісаць добры падручнік?

— Акрамя вырашэння пытанняў інфармацыйнага і дыдактычнага характару, трэба зрабіць яшчэ шмат. Падручнік сёння, і яшчэ ў большай меры заўтра – з'ява полідысцыплінарная. Тут неабходны таксама намаганні філосафаў, гісторыкаў, псіхолагаў, лінгвістаў, дызайнераў.

— Якія напрамкі работы над праблемай падручніка асабіста вам найбольш цікавыя?

— Адзін напрамак ужо быў названы – гэта логіка пабудовы мадэлі вучэбнага прадмета, другі – гэта дыферэнцыяцыя тэксту падручніка па ўзроўнях і відах здольнасцей вучняў. Узяць хоць бы вядомы падзел на "фізікаў" і "лірыкаў". Сёння дастаткова пераканаўча даказана, што ён абумоўлены асаблівасцямі функцыянавання і спецыялізацыі левага і правага паўшар'яў мозга. У цэласнай структуры індывідуальнасці гэта звязана з памяццю, матывацыяй, рысамі характару, тэмпераменту і ў больш шырокім – з пазнаннем.

— Пагадзіцеся, што, акрамя іншага, хацелася б мець падручнік і прыгожы на выгляд. Бо, па сцвярджэнні псіхолагаў, усе кампаненты вучэбнай інфармацыі звязаны праз візуальна-прасторавае і пачуццёвае ўспрыманне.

— Безумоўна, афармленне падручніка, яго знешні выгляд і ілюстрацыйны матэрыял з'яўляюцца паказчыкамі інфармацыйнай культуры выдання. Усё гэта ўжо на падсвядомым узроўні павінна павышаць цікавасць да падручніка, жаданне ўзяць яго ў рукі. Цяпер ёсць дастатова распрацаваная тэорыя каляровага ўспрымання кніжнай інфармацыі, але наша рэчаіснасць у большасці выпадкаў – чорна-белыя карцінкі. Каляровая гама ілюстрацый не павінна быць абстрактнай, яе прызначэнне – данесці да нас сэнс светапазнання і светаадчування эпохі. Як вядома, кожная эпоха мела свой дамінуючы колер і свае трактоўкі яго ўспрымання.

— Усе мы памятаем, як у дзяцінстве захоплена чыталі апавяданні А.Неміроўскага, міфы Н.Куна, а ў больш старэйшым узросце - гістарычныя аповесці і раманы. Як цяпер выкарыстоўваецца сіла мастацкага слова і вобраза для "ўжывання" ў гістарычную рэчаіснасць?

— Гэта асобны бок агульнай праблемы падручнікаў для вучняў. Для паляпшэння стылю тэксту падручніка, надання яму літаратурна-эстэтычных якасцей пажадана, каб у стварэнні падручнікаў удзельнічалі і літаратары. Асабліва гэта датычыць малодшага школьнага ўзросту, дзе для вучэбных тэкстаў рэкамендуецца форма літаратурна-сюжэтнага аповеду.

— Цяпер найбольш актуальна гаварыць пра выхаванне патрыятызму, фарміраванне грамадзянскай пазіцыі, інтэлектуальных здольнасцей, нацыянальнай самасвядомасці і духоўнасці. Якое ваша бачанне выхаваўчых мэт гістарычнай адукацыі ў глабальным плане?

— Я станоўча стаўлюся да сказанага вамі, але ў вызначэнні вышэйшых мэт і каштоўнасцей адукацыі хацелася б звярнуцца да ідэй Макса Шэлера. Ён вылучаў тры вышэйшыя мэты станаўлення, якім могуць і павінны служыць веды. Па-першае, станаўленню асобы – гэта "адукацыйныя веды"; па-другое, станаўленню свету – гэта "выратавальныя веды" і, нарэшце, па-трэцяе, "веды дзеля панавання". Паміж гэтымі трыма мэтамі існуе іерархія: ад ведаў дзеля панавання шлях ляжыць да адукацыйных ведаў і далей – да выратавальных ведаў. "Так званых "ведаў дзеля ведаў" не існуе нідзе, іх не можа і не "павінна" быць увогуле".

— Напрыканцы раскажыце пра тое, як ваш часопіс будзе ўдзельнічаць у ажыццяўленні задач гістарычнай адукацыі і выказаных вамі ідэй?

— "Гісторыя: праблемы выкладання" – гэта адзін з 21 часопіса серыі, адрасаванай сярэдняй агульнаадукацыйнай школе. Гэта комплекс часопісаў на чале з часопісам "Адукацыя і выхаванне", якім кіруе ініцыятар і падзвіжнік гэтай справы, галоўны рэдактар У.П.Пархоменка. Мы ганарымся тым, што ўваходзім у склад гэтага выдання, якое забяспечвае інфармацыйную прастору школьнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Наш часопіс паступова мяняе свой характар: калі раней мы працавалі пераважна дзеля таго, каб ліквідаваць недахоп метадычнай літаратуры, дык цяпер мы ўсё больш прымаем на сябе ролю праваднікоў у вялізным кніжным свеце. Выступаючы за адзіную адукацыйную прастору з Расіяй, мы інфармуем чытача не толькі пра нацыянальныя, але і пра расійскія выданні. Гэтая інфармацыя з'яўляецца цікавай і карыснай для абодвух бакоў. Пра гэта сведчыць выпуск расійскага часопіса "Выкладанне гісторыі ў школе" (№ 8, 2000 г.) на матэрыяле беларускіх аўтараў, а таксама нашы рэцэнзіі на расійскія выданні.

У бягучым каляндарным годзе мы будзем працаваць у традыцыйных для нас напрамках: абнаўленне зместу гістарычнай адукацыі, удасканаленне дыдактыкі і тэхналогій навучання. Будуць уведзены рубрыкі "Праблемы школьнага падручніка" і "Філасофія гістарычнай адукацыі".

Мы будзем публікаваць матэрыялы па новых гістарычных даследаваннях, метадалогіі гістарычнага даследавання і філасофіі гістарычнай адукацыі. Галоўным па-ранейшаму застанецца напрамак дыдактыкі і адукацыйных тэхналогій. Мы маем намер публікаваць фрагменты рукапісаў новых падручнікаў, метадычныя распрацоўкі, інфармацыю пра найноўшую літаратуру. І апошняе. Дазвольце выказаць удзячнасць нашым аўтарам, падпісчыкам і проста чытачам за творчую, матэрыяльную і маральную падтрымку. Таго ж жадаем чытачам і падпісчыкам "Настаўніцкай газеты".

Гутарыў А.МІКАЛАЕЎ.

Зіма – гэта мароз і радасць, лічыць Наталля Белянкова. У Крычаўскім цэнтры культуры, дзе яна стварыла дзіцячы фальклорны ансамбль і пасля заканчэння Магілёўскага вучылішча культуры вучыць моладзь танцам, ідзе падрыхтоўка да навагодніх святаў.

Фота Валерыя БЫСАВА, БЕЛТА.

Званок з рэдакцыі

Драматычная сітуацыя вырашана

Далася, як кажуць, у знакі мінулагодняя зіма настаўнікам і вучням Зашырскай сярэдняй школы Ельскага раёна. Яны паведамлялі, што ў лютаўскія маразы тэмпература ў класных пакоях не падымалася вышэй +8°...

Ці ўлічаны ўрокі мінулагодняй зімы? Якія захады прынялі мясцовыя ўлады, каб карэнным чынам выправіць становішча, каб у рэшце рашт школьныя памяшканні займелі належны тэмпературны баланс?

Як паведаміла рэдакцыі дырэктар школы Марыя Ляшкевіч, выйсце знойдзена ў наступным: задзейнічана аўтаномная (школьная) кацельня, магутнасці якой дастаткова для забеспячэння навучальнай установы цяплом. Гарантыя гэтаму - як яе тэхнічны стан, так і назапашаная колькасць цвёрдага паліва (у пераважнай большасці).

Марыя Аляксандраўна расказала, што справай прадметна зацікавіліся мясцовыя ўлады - нават абласныя. У выніку драматычная сітуацыя, якая склалася вакол Зашырскай сярэдняй школы, была вырашана.

Дзейсную дапамогу, паводле слоў Марыі Аляксандраўны, аказала ўпраўленне адукацыі Гомельскага аблвыканкама, у прыватнасці яго начальнік Андрэй Лук'яновіч.

Наш кар.

Увага: конкурс!

Прыз — каляровы тэлевізар

Рэдакцыя "Настаўніцкай газеты" аб'яўляе конкурс для сваіх індывідуальных падпісчыкаў.

Умовы конкурсу:

1. Удзельніку конкурсу неабходна даслаць у рэдакцыю пісьмо, у якім назваць магчымы падпісны тыраж на "Настаўніцкую газету" на I студзеня 2002 года. Тыраж называецца прапіснымі лічбамі.

2. У пісьме ўказваецца хатні адрас удзельніка, нумар хатняга або службовага тэлефона (калі ён ёсць).

Да пісьма прыкладаецца копія падпіснога абанемента (ксеракопія або напісаная ад рукі).

3. Пераможцам конкурсу стане той удзельнік, які дакладна назаве лічбу тыражу. У выпадку, калі дакладная лічба не будзе названа, пераможцам становіцца той, хто назаве лічбу, найбольш прыбліжаную да рэальнай. Калі ж прэтэндэнтаў будзе некалькі, то пераможцу вызначыць жараб'ёўка, праведзеная журы конкурсу.

4. Пры атрыманні прыза пераможцу неабходна прад'явіць рэдакцыі арыгінал падпіснога абанемента.

5. Удзельнічаць у конкурсе маюць права чытачы, якія аформілі падпіску на "Настаўніцкую газету" не менш чым на тры месяцы ў першым паўгоддзі 2002 года.

6. Пісьмы аб удзеле ў конкурсе прымаюцца па пошце або непасрэдна рэдакцыяй не пазней 21 снежня 2001 года па адрасе: 220034, Мінск, вул. Захарава, 42, рэдакцыя "Настаўніцкай газеты" з паметкай "На конкурс".

7. Пераможцу ўстанаўліваецца прыз - каляровы тэлевізар з экранам па дыяганалі - 54 см.

8. Вынікі конкурсу падводзяцца журы не пазней 20 студзеня 2002 года.

Для прыкладу: падпісны тыраж "Настаўніцкай газеты" на IV квартал 2001 г. склаў 27.212 экзэмпляраў.

Даведкі па тэл.: 236-40-63, 236-53-22, 236-91-42.

Тое, што ў другім Рэспубліканскім экалагічным турніры, правядзенне якога ператвараецца ў добрую традыцыю сумеснай працы Міністэрства адукацыі і грамадскай арганізацыі "Беларускі зялёны крыж", пажадала прыняць актыўны ўдзел больш як трыццаць вучнёўскіх каманд з усіх абласцей нашай краіны, сталася прыемнай нечаканасцю для ўсіх.

"Жывая вада" надае сілы

Адбыўся II адкрыты Рэспубліканскі экалагічны турнір

Прыехала на экалагічны турнір у сталіцу 28 каманд. Паспаборнічаць у ведах па біялогіі, хіміі, фізіцы, матэматыцы, геаграфіі (а такая навука як экалогія для вырашэння сваіх праблем патрабуе глыбокага ведання ў першую чаргу менавіта гэтых дысцыплін, нароўні з ліцэістамі, гімназістамі, вучнямі сталіцы, абласных, раённых гарадоў вырашылі і юныя эколагі з Селявіцкай, Сенькаўшчынскай школ Слонімскага раёна, а таксама вучні з Козенскай школы Мазырскага раёна.

Тры дні ў ліцэі № 2 Мінска літаральна бушаваў сапраўдны напал барацьбы. Асабліва перажывалі за сваіх выхаванцаў настаўнікі, кіраўнікі каманд. І было чаму: уявіце сабе, як крыўдна не ўвайсці ў фінал турніру, набраўшы салідную колькасць агульных балаў, але не вытрымаўшы рэйтынгу сапернікаў. Аднак кампетэнтнае журы, у склад якога ўвайшлі вядомыя ў нашай краіне навукоўцы, загадчыкі кафедраў БДУ і Міжнароднага дзяржаўнага экалагічнага універсітэта імя А.Д.Сахарава, карысталася міжнароднай сістэмай у ацэнцы як дакладаў, так і выступленняў апанентаў ды рэцэнзентаў з ліку ўдзельнікаў турніру.

У фінал выйшлі тры каманды: старшакласнікі ліцэя пры БДУ (Мінск), вучні сталічнай школы № 22 і навучэнцы ліцэя пры Наваполацкім універсітэце.

Першай пачала змагацца за перамогу каманда са сталічнага ліцэя пры БДУ.

Дзеля таго каб аргументавана даказаць журы, групам апанентаў і рэцэнзентаў пераваг у выкарыстанні пэўных мыйных сродкаў, камандзе прыйшлося перамыць цэлую "гару" бруднага посуду (відэазапіс). У выніку эксперыменту яны вызначылі растваральнасць розных рэчываў, залежнасць паверхневага натяжэння ад канцэнтрацыі раствору, іншыя параметры. Прадстаўнік каманды Павел Велігураў усе гэтыя даследаванні дакладна пералічыў, а некаторыя – прадэманстраваў на запісанай відэастужцы.

Апаненты задавалі каверзныя пытанні, іх дапаўнялі і паглыблялі рэцэнзенты, потым была чарга за журы. Каманда змагла адстаяць свае пазіцыі.

Але самым цікавым было даследаванне нафтавых, масляных і бензінавых плевак на вадзе, якое правяла каманда з ліцэя пры Наваполацкім універсітэце. Юныя эколагі сфатаграфавалі пад мікраскопам кроплі прадуктаў, выпрацаваных з нафты, змаглі зрабіць замер таўшчыні плямы, вызначылі хуткасць яе распаўсюджання на паверхні вады, а таксама паведамілі пра спосабы знішчэння бензінавых і нафтавых плям.

Пытанні апанентаў і членаў журы былі няпростымі, накшталт: ад чаго залежыць колер плямы, экалагічна чыстае дызельнае паліва – што гэта такое, якую шкоду наносяць навакольнаму асяроддзю прадукты нафтаперапрацоўкі?

І на ўсе пытанні юныя даследчыкі давалі глыбокія, грунтоўныя адказы. Журы, разам з апанентамі і рэцэнзентамі, выставіла камандзе з Наваполацка самыя высокія балы.

А вось вучні з сярэдняй школы № 22 Мінска ў выніку электролізу атрымалі "жывую" і "мёртвую" ваду. Сваё паведамленне пра эксперымент Вольга Алісіёнак пачала з паэтычнага выказвання пра ўласцівасці вады знакамітага Антуана дэ Сэнт-Экзюперы. Старшакласніца праявіла мужнасць і знаходлівасць, адказваючы на шматлікія пытанні і крытычныя заўвагі, і разам з камандай змагла аргументавана даказаць вартасць праведзенага даследавання.

І вось, нарэшце, наступіў самы прыемны момант – узнагароджанне, як у камандным заліку, так і ў асобных намінацыях. Сертыфікат з рук старшыні журы прарэктара Міжнароднага дзяржаўнага экалагічнага універсітэта імя А.Д.Сахарава Андрэя Цімошчанкі атрымаў кожны ўдзельнік турніру. Пераможцы – каманда ліцэя пры Наваполацкім універсітэце (педагогі Л.Абуховіч і М.Івагноў) – узнагароджаны дыпломамі першай ступені і каштоўнымі прызамі, другое месца заваявала каманда сярэдняй школы № 22 Мінска (педагог Л.Казак, кансультант Ю.Разум) і трэцяе – старшакласнікі ліцэя пры БДУ. У асабістым заліку лепшым вызначаны Максім Скотнікаў (сярэдняя школа № 25 пас.Балбасава Аршанскага раёна).

У шматлікіх намінацыях, накшталт – лепшы апанент, рэцэнзент, даклад і інш., арганізатары турніру, прадстаўнікі "Зялёнага крыжа", пастараліся не пакінуць без увагі амаль усіх удзельнікаў спаборніцтваў. Так, напрыклад, прызы "За самы доўгі шлях да турніру" атрымала каманда Селявіцкай школы.

А вось што сказаў напрыканцы падзеі старшыня журы Андрэй Цімошчанка:

– Прыемна, што экалагічны турнір набірае абароты становіцца папулярным сярод вучняў не толькі гарадскіх, але і сельскіх школ. Дзеці змагаліся ў складаных умовах, многія каманды вучыліся адстойваць свае веды ў ходзе спаборніцтваў. Тут праявілася ўменне працаваць у калектыве. І лепш выглядалі тыя вучні, у школах якіх дзейнічаюць дыскусійныя клубы. Шчат папрацавалі са сваімі выхаванцамі настаўнікі. І ёсць яркія асобы ў многіх камандах гэта нашы будучыя абітурыенты. Мы бачым сваю задачу ў тым, каб развіваць і падтрымліваць таленавітых дзяцей. Калі яшчэ ў школе старшакласнік будзе мець матывацыю да вывучэння той ці іншай дысцыпліны, дык і студэнтам ён будзе паспяховым, авалодваць выбранай ім прафесіяй. Лепш, калі падрыхтоўка спецыяліста пачынаецца ў школе, дзе вучні маюць магчымасць атрымаць першыя навыкі даследаванняў. Такія экалагічныя турніры дапамагаюць нам у выбары будучых студэнтаў. І добра, што праводзяцца такія спаборніцтвы па ініцыятыве грамадскай арганізацыі "Беларускі Зялёны крыж" (выканаўчы дырэктар У.Шаўцоў).

І напярэдадні – новы Рэспубліканскі турнір "Дзень Зямлі. Беларусь-2002". У добры шлях, ініцыятыва!

Ірына КУЛІКОЎСКІХ.

Да ўвагі арганізатараў конкурсу "Кенгуру"- 2002

20–21 снежня ў актавай зале СШ №50 г. Мінска (вул. Кісялёва, 9, праезд з вакзала на метро да станцыі "Плошча Перамогі") адбудзецца рэспубліканскі семінар для прадстаўнікоў раённых і гарадскіх аддзелаў адукацыі – арганізатараў конкурсу "Кенгуру".

Пачатак работы семінара ў 11.00. Рэгістрацыя ўдзельнікаў – з 10.00.

Заяўкі на ўдзел у семінары прымаюцца да 17 снежня 2001 года. На семінары будуць падведзены вынікі конкурсу 2001 года, абмеркаваны арганізацыйныя пытанні, звязаныя з правядзеннем конкурсу "Кенгуру"–2002. Удзельнікі семінара абмяняюцца вопытам работы, атрымаюць неабходныя для арганізацыі і правядзення конкурсу матэрыялы.

Па ўсіх пытаннях, якія звязаны з удзелам у конкурсе і работай семінара, звяртацца на адрас: РЭФМХШ ("Кенгуру"), 220013, Мінск, вул. Дарашэвіча, 3, тэл. (017) 239-91-72, 232-80-31.

Паважаныя чытачы!

Працягваецца падпіска на першае паўгоддзе 2002 года. Падпісацца на "Настаўніцкую газету" можна ў любым паштовым аддзяленні ці ў агенцтве "Белсаюздруку".

газета НАСТАЎНІЦКАЯ — выданне асветнікаў Рэспублікі Беларусь

Падпісны кошт на паўгоддзе
для індывідуальных падпісчыкаў – 8400 рублёў;
на квартал – 4200 рублёў;
на месяц – 1400 рублёў.
Па ведамаснай падпісцы: на паўгоддзе – 22800 рублёў; на квартал – 11400 рублёў;
на месяц – 3800 рублёў.
Індэкс для індывідуальнай падпіскі — 63867,
для ведамаснай — 63363.

НА ЗДЫМКУ: настаўніца сярэдняй школы № 118 Мінска Наталля Магаляс на занятках з дзецьмі ў пазаўрочны час.

Фота Юрыя БОНДАРАВА.

Роздум над праблемай

Бумеранг,

або Пралікі педагога жорстка помсцяць і ў вялікім, і ў малым

Усе мы, настаўнікі, стараннa ўглядаемся ў маладыя твары: юныя грамадзяне краіны - якія яны? Як выхоўваюцца? Якімі вырастуць?

Параўнальна нядаўна ўражанні дзіцяці абмяжоўваліся сціплым трохвугольнікам: сям'я – двор – школа. І, вядома, стварацъ патрэбныя педагагічныя сітуацыі было куды прасцей. Сёння – інакш. Усё жыццё планеты па тысячах каналаў (мы гэта бачым) увайшло і ў нашы дамы. Любую інфармацыю можна атрымаць дзякуючы сетцы Інтэрнет. Нашы дзеці маюць неабмежаваныя магчымасці выбару – прычым стыхійнага! – самых розных маральных катэгорый. І вось праблема: лоцманы ў гэтым акіяне патрабуюцца вельмі вопытныя! Каб дапамагчы маладым разабрацца ў незвычайна зменлівым каскадзе ўражанняў. Дапамагчы ў адносна малым – выхаваць густ, добрыя манеры. Дапамагчы і ў бясконца больш важным – знайсці сваё месца ў агульнай чалавечай супольнасці. Месца грамадзяніна.

Хто ж настаўнікі ў гэтай школе пачуццяў? Ды многія: дыктары радыё і тэлебачання, старонка ў Інтэрнеце і кадры відэапорна, свежы газетны ліст і старыя брыдкія чуткі, суседзі па пад'ездзе і людзі на другім канцы планеты, густ і вычварнасць, талент і ардынарнасць... Лавіна самых розных перажыванняў усё нарастае і ў рэшце рэшт можа накрыць з галавой!

Вы спытаеце: а школа, а мы, настаўнікі – педагогі, класныя кіраўнікі, арганізатары, сацыяльныя педагогі і псіхолагі, – дзе наша месца ў гэтай вялізнай выхаваўчай рабоце?.. А бацькі?

ЯНЫ - ТАКІЯ, ЯК І МЫ БЫЛІ КАЛІСЬЦІ...

Ну, як не згадаць грыбаедаўскага Фамусава: "...учились бы, на старших глядя". Старэйшыя... Наша адказнасць асабліва павялічваецца, калі праблемная сітуацыя выходзіць за рамкі так званых "простых", жыццёвых акалічнасцей. Думка – не новая і быццам бы цалкам відавочная. Згодна. І ўсё ж я не выпадкова нагадала вядомае і беспярэчнае. На жаль, нярэдка даводзіцца чуць: "Нічога разумець не хочуць!" Пра каго гэта? Гэта – пра дзяцей, якія жывуць у разладзе з планамі дарослых. Але ў каторы раз, прагаворваючы адно і тое ж, многія з нас забываюць паглядзець на саміх сябе! Джон Лок яшчэ ў XVII стагоддзі пісаў: "Мы не павінны забываць, што нашы дзеці, стаўшы дарослымі, вельмі нагадваюць нас, маюць тыя ж схільнасці і тыя ж жаданні, што і мы... Але мы... не любім штодзённых ушчуванняў і вымоў, не выносім, калі тыя, з кім даводзіцца мець справу, звяртаюцца да нас у суровым і загадным тоне або трымаюць нас на прыкметнай адстані адлегласці..." Прашу прабачэння за падрабязную цытату, але, думаю, яна аказалася дарэчы.

Як часцей за ўсё мы падыходзім да жывой справы выхавання? Мы наіўна лічым, што дастаткова акрэсліць мэты выхавання і "праявіць энергію". І калі пры гэтым жывыя дзеці не ўкладваюцца ў жаданыя эталоны, "выскокваюць" з нашых рамак, вінаватымі аказваюцца яны самі. Гэта вельмі сумна! Менавіта мы, старэйшыя, адказныя не толькі за ўказанне мэт, за ўстанаўленне маральных ідэалаў, але і за выбар сродкаў выхавання. Бо хочам мы гэтага або не – але ўвесь час знаходзімся пад пільным позіркам дзіцячых вачэй.

Ёсць такое паняцце – "маральна недазволенае". Бывае, што "на карысць справе", у імя высокіх мэт мы звяртаемся якраз да гэтага "маральна недазволенага" прыёму – "падахвочваем" да вучэння запісам у дзённіку, пагрозай паведаміць бацькам, выносім на абмеркаванне класа асабістыя праблемы старшакласніцы... Колькі іх, такіх "карысных" павучанняў, даводзіцца выслухоўваць нашым дзецям! І ўсё гэта, зразумела, дзеля... іх жа саміх.

Давайце прыглядзімся да будняў выхавання, да вольных або нявольных нашых памылак. Як часта мы на класных гадзінах палымяна і горача гаворым, гаворым, не заўважаючы, як гаснуць вочы і замыкаюцца ў сабе нашы дзеці. Голыя фразы, павучанні, ушчуванні, натацыі – а ў выніку?

Вы спытаеце, як можна пазбегнуць падобнага і хто так робіць?

ТОЕ, ШТО СПРАЦОЎВАЕ

У 2000–2001 навучальным годзе вясной у Гомелі праходзіў чарговы, ужо традыцыйны, конкурс класных кіраўнікоў "Наш класны – самы класны" пад дэвізам "Мой горад пачынаецца з мяне". Мне як члену журы пашчасціла пабачыць па-сапраўднаму таленавітых, апантаных "класных". Але спыніцца хачу на сваёй школе № 1. Хоць гэтым разам мы не аказаліся ў ліку лаўрэатаў і прызёраў, паказальнай, як мне здаецца, будзе звычайная класная гадзіна, напрыклад, М.В.Зіноўевай. Можна горача і ўсхвалявана пераконваць дзяцей у неабходнасці падтрымліваць чысціню ў пад'ездах, у школе, у класе – а можна прайсціся з відэакамерай па гэтых самых лесвіцах і калідорах, зняць на стужку размаляваныя сцены, засмечаны школьны двор, запляваную падлогу... Потым гэтая касета хадзіла "па руках": відэазапіс паказвалі і на бацькоўскіх сходах, і на ўроках этычнай граматыкі, іншыя школы прасілі касету напракат. Пагадзіцеся, што сур'ёзная размова пра тое, што "мой горад пачынаецца з мяне", падмацаваная відэасюжэтам з карцінкамі, знаёмымі да болю, стане сапраўды карыснай. Або – вялікая даследчая праца дзяцей пад кіраўніцтвам Т.Н.Калеснік, дырэктара школьнага музея, калі ўвазе слухачоў і гледачоў прапануецца ўся гісторыя роднага пасёлка Навабеліцы ў фатаграфіях, пісьмах, дакументах, сачыненнях...

У нашых пасталелых дзяцей выпрацоўваецца даволі стойкі імунітэт да нашага красамоўства. Адкуль? І словы вымаўляем правільныя, і павучанні нашы разумныя, а ў адказ – цішыня. Або рашучае: "Не перастануць ушчуваць – збягу!" І збягаюць. Куды? Хіба так ужо важна куды? Яны бягуць ад нас з вамі – бяда вось у чым!

Мне здаецца, што праблему "уцёкаў" дзяцей трэба не толькі закрануць, але і завастрыць, прычым зрабіць гэта трэба адкрыта, каб усе пачулі. Так нарадзілася ідэя літаратурна-публіцыстычнага вечара "Усёведанне Прарока". Акрамя блокаўскіх праноцтваў пра катаклізмы XX стагоддзя гледачы ўбачылі і пачулі маналог героя Д–503 з рамана Я.Замяціна "Мы", выказванні "флевераў" і "макрацоў" – герояў рамана братоў Стругацкіх. А ў канцы вечара разгарэлася сапраўдная дыскусія аб прычынах уцёкаў дзяцей з дому, са школы, прычым дыялог ішоў паміж дзецьмі і іх бацькамі, якія былі запрошаны на вечар. І што дзіўна, менавіта ў той дзень атрымалася шчырая і зацікаўленая размова "бацькоў" і "дзяцей", і заклік да ўзаемаразумення прагучаў з абодвух бакоў. Так, мы, арганізатары вечара, хваляваліся і перажывалі: ці зразумеюць, ці пачуюць бацькі боль сваіх дзяцей, іх крыўду, прыкрасць, расчараванне – і наадварот, ці не перабольшаць дзеці з папрокамі і абвінавачваннямі?..

Аднак мы пераканаліся, што і тым і другім трэба было выгаварыцца, каб вызначыцца на будучыню.

НА АСОБУ ЦІ СУПРАЦЬ ЯЕ

Што ўтойваць, часам даходзіць да анекдатычнасці, калі энергічная і прадпрымальная класная кіраўніца ставіць перад сабой задачу: ліквідаваць спісванне. Правяла, як звычайна, адпаведныя гутаркі, арганізавала ўрок этычнай граматыкі "Жыві сваёй працай". І – ура! – спісваць перасталі! Аднак раптам выявялося, што маладых людзей узнікае своеасаблівы "паддашак", куды ў сакрэце ад іншых складваюцца розныя памылковыя погляды, усялякія "пытальнікі", пачуцці і думкі, якія знаходзяцца ў разладзе з уласным вопытам. І аднойчы, будзьце ўпэўнены, "паддашак" спрацуе! І гэта будзе зусім не "раптам", проста мы пра яго не ведалі, прайшлі міма. Чаму? Ды вельмі проста: мы ж спяшаемся, нам трэба зрабіць справаздачу, далажыць – адным словам, паставіць "птушачку". Ці вінаваты ў гэтым толькі школа і класныя кіраўнікі? На жаль, школа вельмі часта аказваецца ва ўмовах бегуна на кароткія дыстанцыі: агляды (на ўсіх узроўнях – ад раённага да рэспубліканскага), фестывалі, конкурсы займаюць процьму часу і не дазваляюць уважліва ставіцца да кожнага канкрэтнага выхаванца. Але гады выхавання – не спартыўная "стометроўка"!

Класны кіраўнік, няхай ён нават самы "класны", не ў стане проста фізічна паспець ажыццявіць запланаванае, прааналізаваць кожную праблемную сітуацыю, перш чым паспрабаваць яе вырашыць, па той простай прычыне, што ён – адзін! Як у прымаўцы: "І жнец, і касец, і на дудзе ігрэц".

Відавочна, трэба пераглядзець сам інстытут "класнага кіраўніцтва". На І з'ездзе настаўнікаў Беларусі прагучала, на мой погляд, цікавая думка аб увядзенні адзінкі "вызваленага класнага кіраўніка", які і займаўся б пытаннямі выхаваўчай работы. Педагогаў-арганізатараў можна размеркаваць па паралелях для наладжвання пазакласнай работы. Больш кваліфікаваным павінен быць падыход да падбору псіхолагаў і сацыяльных педагогаў – мы чакаем ад іх індывідуальнай, карпатлівай працы з кожным дзіцем, а не толькі анкетавання і далейшага яго аналізу. Трэба толькі плаціць адпаведна статусу гэтых работнікаў, як, зрэшты, і ўсім нам.

Таленавіты чалавек заўсёды знойдзе неардынарныя, нестандартныя прыёмы работы з дзецьмі. Што да класнага кіраўніка, то, будучы добрым настаўнікам-прадметнікам, ён часта "прайграе" ў арганізацыі КВЗ, аглядаў, фестываляў мастацкай самадзейнасці. Дык давайце пакінем песні і танцы тым, у каго гэта атрымліваецца лепш, ды заплацім ім як належыць, а потым папросім у іх справаздачы.

Школьны дом. Адсюль бяруць пачатак чалавечыя лёсы. Так было раней, так застаецца і цяпер. І дарослыя нясуць вялізную адказнасць за тое, каб дапамачы дзецям выйсці на правільную дарогу, не даць паслізнуцца, сысці на арбіты, далёкія ад разлічаных.

Людміла ЛЫСОВА,
настаўніца сярэдняй школы № 1 Гомеля,
класны кіраўнік.

Фарміраванне душы

"Мастацкі твор – размова "пра мяне"

Асэнсаванне таго, якімі павінны быць сучасныя настаўнікі літаратуры і ўрокі літаратуры - праблема вельмі актуальная. З майго пункту гледжання, найноўшыя метадычныя прапановы не могуць быць прыняты за вычарпальныя, пакуль грамадства не распрацуе філасофію спасціжэння мастацкай літаратуры ў школе.

На нашу думку, сёння патрэбен такі ўрок літаратуры, якога б вучань чакаў і прагна шукаў сустрэчы з ім. Пакінем у даным выпадку такія шляхетныя феномены як прыёмы методыкі, майстэрства педагога ці яго добрае сэрца. Згаданае вышэй чаканне павінна быць абумоўлена іншым: інтуітыўным прадчуццём школьніка (і настаўніка), што спатканне з мастацкім вобразам дапаможа яго душы, зменіць какафонію жыццёвых стрэсаў у ім на музыку ўнутранай гармоніі. Так што методыка, пабудаваная на абучэнні (такая сёння існуе), павінна быць падпарадкавана іншай, мэта якой – выратаванне асобнай душы сродкамі літаратурнага вобраза (такой методыкі сёння не існуе).

Зразумела: літаратура – адна з формаў пазнання жыцця. Але чаму, прамаўляючы ў даным выпадку "жыццё", мы перш за ўсё маем на ўвазе з'явы знешнія ў дачыненні да асобы? Ці не час ва ўвесь голас прамовіць, што літаратура – гэта адна (часам – адзіная) форма спасціжэння чытачом свайго ўнутранага жыцця, што ў гэтым і заключаецца асноўнае і фундаментальнае яе прызначэнне? А, зразумеўшы гэта, пачнем будаваць урок літаратуры згодна з выказанаю аксіёмаю.

***

Мастацкі твор – гэта размова "пра мяне". А калі не "пра мяне", дык ці маральна падглядваць за жыццём суседа (персанажа)? Ды і бессэнсоўна гэта рабіць, бо чужы вопыт з маім уласным лёсам усё роўна не супадзе. Але вось калі ў кожным з вялікасных тварэнняў славеснага мастацтва я адчую вобразнае ўвасабленне сваёй душы, тады чытанне стане для мяне справай жыццёва патрэбнай і горача чакаемай. (Сённяшнія разважанні пра тое, што чалавецтва быццам бы забудзецца пра кнігу і заменіць яе тэлеэкранам, – беспадстаўныя: экран пазбаўляе гледача творчасці, а без творчасці асоба выжыць не ў стане).

Калі твор – "сімвал мяне самога", тады мне асабліва патрэбна ўспрымаць яго ў той форме, у якой ён створаны. Напрыклад, ці мажліва пры вывучэнні, скажам, аповесці, прадстаўляць яе сюжэт на ўроку ў выглядзе кінасцэнарыя (раскадроўка, першы план, другі план і г.д.)? Твор – дзіця сэрца. Ён нарадзіўся аповесцю. Такім жыве і будзе жыць вечна. Падмяняць першасны жанр жанрам штучным, у імя нейкай апрыёрнай мэты абраным – справа шкодная.

Так, літаратура дае вучню звесткі не толькі пра свет і ўнутраны, і знешні. Але нельга, на нашу думку, бязмежна набліжаць школьнае спасціжэнне літаратуры да яе навуковага вывучэння. Трэба цвёрда і адназначна заявіць, што мэты асэнсавання мастацкага тэксту ў школе і ў фундаментальным літаратуразнаўстве розныя. Навука толькі рыхтуе чытача (рэцыпіента) да спасціжэння духоўнага сэнсу твора. Настаўнік жа літаратуры – дойлід, пігмаліён. Сродкамі вобраза ён лепіць душу (перш за ўсё – сваю, у выніку чаго ствараецца і душа вучня). Такім чынам, актуальнымі сёння, на наш погляд, з'яўляюцца не пошукі новых методык, а выпрацоўка сучаснай філасофіі ўрока літаратуры.

Нам няма куды падзецца ад пытання: "Чаму ў царкве мастацкі тэкст прыводзіць вернікаў у стан анёльскай чысціні, а на школьным уроку гэтага часам не толькі няма, але такая мэта нават і не ставіцца педагогам?" Няўжо толькі таму, што ў храме збіраюцца людзі ў асноўным дарослыя, а ў класе – юныя? Мы ведаем, што ўсе дарослыя – "дзеці", а ўсе дзеці – "дарослыя". **Ці не час выказацца, што сацыялізацыя індывідуума - справа немажлівая да той пары, пакуль яна не будзе ўраўнаважана індывідуалізацыяй соцыума?** Але дзе методыка індывідуалізацыі соцыума? Чаму чалавецтва, якое знаходзіцца ў ганебным маральным стане (тэрарызм, цынізм і г.д.), упэўнена, што яно ў стане "сацыялізаваць асобу"?

***

Трэба адзначыць і яшчэ адно: сучасны вучань не верыць настаўніку літаратуры. І "віна" педагога тут толькі ў тым, што ён прыйшоў у клас са свету дарослых. Гэты недавер – гаючы, бо ён уяўляе сабою форму процістаяння світальнай рамантычнай душы паўдзённаму сонцу дарослага прагматызму. Дык як жа паводзіць сябе настаўніку літаратуры, калі вучань не давярае яму? Нам здаецца, школьнік паверыць педагогу толькі тады, калі настаўнік "перастане быць настаўнікам", гэта значыць (няхай не на словах, а паставаю сваёю) "прызнаецца", што ён, як і ўсё грамадства, не ведае выйсця з сённяшняга маральнага крызісу, і таксама, як і вучні, спадзяецца адшукаць споведзь у чарадзейнай глыбіні мастацкага вобраза.

А чаму менавіта – вобраза? Ды таму, што вобразы створаны багамі (гэта значыць звычайнымі людзьмі ў боскім узнясенні душы). І калі на ўроку будзе прамоўлена, што вучні і настаўнік сабраліся сёння не дзеля сумеснага "аналізу" твора, а для сумеснага лячэння душы нябеснай чысцінёю таго ці іншага паэтычнага тэксту, узнікне сітуацыя шчаслівай непрадказальнасці. І кожны з прысутных у класе адчуе: у краіне цудаў, у якую сёння яны выправіліся, ён абавязкова сустрэнецца з самім сабою: можа – на шчасце, можа – на бяду сваю.

Тут патрэбен прыклад. Размова, скажам, ідзе пра верш У.Маякоўскага "Хорошее отношение к лошадям". Агульнае ўяўленне пра паэта вучань ужо мае: "агітатар, гарлан, завадатар", крычыць, мітынгуе, выклікае на палеміку, адным словам – не "для душы", не для пачуццяў, якія выказваюцца шэптам. І вось вучань моўчкі ўчытваецца ў верш. У ім – пра каняку, якая паслізнулася на зімовай маставой і чуе вакол сябе рогат разявак. І няма сярод іх ніводнага, хто б падышоў да небаракі і заспакоіў яе добрым словам. Верш яшчэ не дачытаны да канца, а ў душу ўжо прыходзяць сумненні: а ці Маякоўскі гэта?

Сумненні сумненнямі, але ўсё выразней душу ахоплівае невядомы страх: дык пра мяне ж гэта! Толькі ўчора мяне абразілі, пасмяяліся над маёю ненаўмыснаю памылкаю. І боязна чытаць далей, як няма сіл загадваць сваю будучыню. Але верш працягваецца. Да няшчаснага каня падыходзіць апавядальнік:

Подошёл и вижу глаза лошадиные.

"Глаза лошадиные"... Што ж гэта? Няўжо ў іх той самы боль, што быў у мяне, абражанага? Вочы, у якіх – чаканне абароны. Гэта ж мае вочы. Вядома, ніхто з прысутных у класе не падазрае, што верш – пра мяне. Але вось і істотнае, ратуючае – апавядальнік звяртаецца да няшчаснай скацінкі:

"Лошадь, не надо.
Лошадь, слушайте –
Чего вы думаете, что вы их плоше?
Деточка,
Все мы немножко лошади,
Каждый из нас по-своему лошадь".

Гэтае "лошадь" так лёгка змяніць на "Юра", "Ваня", "Оля", "Галя", "Ніна"...

Дык вось хто такі Маякоўскі! Вось да якога верша я буду звяртацца не аднойчы – і ў дарослым жыцці. Бо ў творы – "лошадь на круп грохнулась". Дык і я ж без гэтага не пражыву, будуць і ў мяне і турботы, і нягоды. І тады У.Маякоўскі зноў скажа мне: "Лошадь, не надо..." А яшча – прачытаўшы верш, я ўжо ведаю, як падтрымліваць свайго будучага сына...

Такое асэнсаванне верша ўзбагаціць чалавека на ўсё жыццё. Вучань на гэтым уроку павінен не даведацца, як сябе паводзіць у жыцці (ён ужо здаўна ведае, што добрым быць добра, а дрэнным – дрэнна). А ён ужо здолее (непрыкметна для самога сябе) знайсці сілы на тое, каб устаць, пайсці, падтрымаць, калі ўсе астатнія – рагочуць і нічым не дапамагаюць.

Можа, толькі ў сталыя гады былы вучань убачыць, што каняка з верша У.Маякоўскага і бяздушны натоўп – жывуць і ў Евангеліі, і ў "Дон Кіхоце" Сервантэса...

Так, на ўроку літаратуры настаўнік павінен выхоўваць падлеткаў. Але, на нашу думку, выхоўваць не аб'яўленнем праўды (твар якой ад чалавецтва закрыты), а сумленным з вучнямі пошукам праўды. І праўды пры гэтым павінна быць роўна столькі, колькі людзей знаходзіцца ў класе. Тады педагогу стане відавочна, што філасофія сучаснага ўрока літаратуры палягае на нераздзельным адзінстве сацыялізацыі індывіда і індывідуалізацыі соцыума. Урок, які грунтуецца на гэтым адзінстве, і патрэбен сёння.

Юрый ПАТАЛКОЎ,
дацэнт Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта.

Педагогіка ўзаемін

Справа была ў класе "В"

Праца класнага кіраўніка - шматгранная, і паспяхова яе выканаць можна пры ўмове цеснай, пастаяннай, дзелавой сувязі з сем'ямі вучняў.

Вось некалькі парад, якія могуць быць карыснымі класнаму кіраўніку:

Наведаўшы вучня дома, вы даведаецеся шмат новага пра дзіця. Усталююцца кантакты з членамі яго сям'і, вы атрымаеце канкрэтнае ўяўленне пра іх аблічча, характар узаемаадносін, прынцыпы і метады сямейнага выхавання. Кожнае наведванне класнага кіраўніка павінна мець сваю мэту. Напрыклад, далучэнне бацькоў да ўдзелу ў жыцці класа, арганізацыя дапамогі бацькоў пры падрыхтоўцы хатніх заданняў. Пажадана пра свой візіт папярэджваць бацькоў загадзя. Звярніце ўвагу на наяўнасць дамашняй бібліятэкі, музычнай тэхнікі, музычных інструментаў у сям'і, умовы вучэбнай работы, пераважныя віды дамашняй дзейнасці вучня, стаўленне да бытавой працы, прыроды, жывёл.

Пачніце гутарку з ацэнкі станоўчых бакоў вучня, свае меркаванні выказвайце паважліва, спакойна, прыводзячы важкія доказы, і ўважліва слухайце пярэчанні бацькоў.

Выкарыстоўвайце розныя формы і метады прапаганды педагагічных ведаў.

Кожны раз, сустракаючыся з бацькамі, вы павінны быць цікавыя ім, пазбягаць паўтарэнняў, аднастайнасці.

Знайдзіце формы далучэння бацькоў да аказання дапамогі класу.

Для вырашэння гэтай задачы можна выкарыстоўваць розныя формы:

– работу з актывам бацькоў;

– класныя бацькоўскія сходы, канферэнцыі;

– сумесныя турыстычныя паходы, экскурсіі;

– індывідуальную і групавую работу з бацькамі, дзе можна размяркоўваць даручэнні і абавязкі.

Напрыклад, рэдкалегія ў дапамогу дзецям, гаспадарчая група па захаванні класнай мэблі і абсталявання, сумесная работа з дзецьмі; кветкаводы-азеляняльнікі, музычная група класа; арганізацыйны камітэт бацькоў і дзяцей па правядзенні рознага роду экскурсій, паходаў, святаў і г.д; індывідуальныя кансультацыі.

Апошні від работы больш, чым іншыя, дазваляе ажыццявіць дыферэнцыраваны падыход да сям'і. У індывідуальнай гутарцы можна даць параду, як пераадолець ілжывасць дзіцяці, замкнутасць, ляноту, выхаваць стрыманасць і г.д.Тэматыка індывідуальных кансультацый закранае кола такіх пытанняў, абмеркаванне якіх у шырокай аўдыторыі для бацькоў непажадана. Пра час правядзення кансультацый неабходна паведаміць загадзя. Не трэба блытаць такую работу з выклікам бацькоў у школу па дробязных прычынах. Не апраўдваюць сябе індывідуальныя гутаркі з бацькамі мімаходзь, у кароткія перапынкі, без яснай педагагічнай мэты.

* * *

Вельмі дзейснай можа аказацца перапіска. Што я маю на ўвазе? Гэта і віншавальныя лісты, і падзячныя пісьмы за добрае выхаванне дзіцяці, гэта і ўрачыстае запрашэнне бацькоў на школьныя святы, вечары. Гэта і пісьмы з падзякай за супрацоўніцтва са школай па месцы працы бацькоў.

Падтрымліваць пастаянную сувязь школы з бацькамі таксама дапамагае вучнёўскі дзённік.

Будзе цудоўна, калі вы пазнаёміцеся з працоўнай дзейнасцю бацькоў. У першую чаргу гэта экскурсіі на прадпрыемствы, якія дапамагаюць арганізоўваць бацькі, расказы пра працоўныя будні, сустрэчы з перадавікамі вытворчасці. Сумеснае афармленне альбома "Сапраўдны скарб для людзей – уменне працаваць".

Аб'ядноўваючы гэтыя формы творчай дзейнасці ў ланцужку "класны кіраўнік – вучань – сям'я", можна стварыць фотаархіў пад назвай "Справа была ў класе В". Поспех такой складанай работы класнага кіраўніка будзе залежыць ад яго прафесійнай падрыхтоўкі і метадычнага майстэрства, агульнай культуры, усебаковага ведання схільнасцей і здольнасцей вучня.

Алена ПАНАМАРОВА,
педагог гімназіі №1
Баранавіч.

Тэлевізар: "злыдзень" ці "акно ў свет"?

Аднойчы вечарам я наведалася ў госці да сваёй добрай знаёмай, якая ўжо даўно скардзілася мне на паводзіны свайго 10-гадовага сына. Хлопец зусім адбіўся ад рук: не рыхтуецца да заняткаў, спрачаецца з настаўніцай, закінуў свае любімыя кнігі, зусім не чытае ў вольны час, сядзіць сабе, утаропіўшыся ў тэлевізар. На ўсю кватэру чуліся стрэлы і крыкі: хлопчык глядзеў чарговы баявік. Здаецца, гэта быў "Тэрмінатар".

Малалетні аматар боек размясціўся на канапе і сачыў за падзеямі на экране, зусім не звяртаючы ўвагі на тое, што моцны гук перашкаджае нам з яго маці размаўляць.

"Я спрабавала абмежаваць гэтыя прагляды, дык крыку было на ўвесь дом!" – скардзілася знаёмая.

Так, тэлевізар стаў неад'емнай часткай інтэр'ера кожнай кватэры, мы не ўяўляем без яго нашага жыцця. А для дзяцей тэлевізар "у кантэксце" з відэамагнітафонам і наборам касет стаў любімым спосабам бавіць вольны ад урокаў час.

На вялікі жаль, разам з удасканаленнем магчымасцей здымкі і спецэфектаў, якія дасягаюцца з дапамогай камп'ютэра, не адбываецца паляпшэння сюжэтаў тых фільмаў, якія прысутнічаюць у праграме амаль кожнага тэлеканала. "Сцэны забойства, насілля, крывавых боек можа назіраць любое дзіця, застаўшыся дома без бацькоў. Гэта адбіваецца на псіхіцы вучняў малодшага ўзросту, адсюль і агрэсія", – лічаць некаторыя настаўнікі. Ці так гэта на самай справе?

Каб адказаць на пытанне, я завітала ў адну з мінскіх школ, дзе звярнулася да 11-гадовых аматараў тэлебачання з прапановай назваць найбольш цікавыя, на іх погляд, фільмы і перадачы. Як паказала апытанне, большасць дзяцей глядзіць расійскія каналы і СТВ. Сярод пералічаных праграм карысталіся госпехам такія, як "Хто хоча стаць мільянерам", "Апошні герой", "Слабае звяно", "Поле цудаў", перадачы пра кулінарыю, мультфільм "Том і Джэры". Сярод фільмаў – амаль усе баевікі і фільмы жахаў кшталту "Мумія", "Мураці", "Тэрмінатар". Героі, якіх выбралі сабе за ідэал вучні чацвёртых класаў, – самыя "радыцыйныя": Даніла Багроў ("Брат-2"), Арнольд Шварцэнегер ("Тэрмінатар"), Жан-Клод Ван Дам і іншыя – усе яны добра валодаюць баявымі прыёмамі і зброяй (згодна з сюжэтам фільма).

– За што вам падабаюцца баевікі? – пытаю вучняў.

– Падабаецца, калі добры герой забівае дрэннага і перамагае! –гаворыць маленькі хлопчык, што сядзіць за першай партай.

– А тое, што пры гэтым льецца кроў, гучыць жудасны крык і чуюцца стрэлы, вас не палохае?

– Дык гэта ж толькі ў кіно! – смяюцца дзеці. Разумеюць, малайцы.

Гутарка з падлеткамі 15 гадоў таксама была цікавай. Тут я пачула цэлы шэраг арыгінальных думак амаль дарослых людзей, якія здольны аргументаваць свае адказы і адстойваць свае меркаванні. Сярод любімых перадач дзевяцікласнікаў пераважаюць такія, як "Слабае звяно" і іншыя інтэлектуальныя гульні, КВЗ. Скандальная перадача "За шклом" стаяла на першым месцы ў большасці 15-гадовых дзяўчат, і толькі дзве з іх далі адмоўны адказ, аргументуючы тым, што ім не падабаюцца паводзіны ўдзельнікаў. Што датычыцца хлопцаў, тут выявіліся іншыя густы. Некаторых маладых людзей ужо цікавіць палітыка: сярод названых перадач былі "Лялькі", "Тушыце святло", "Навіны". Падлеткі назвалі сваімі любімымі фільмамі "Вяселле ў Малінаўцы" і іншыя расійскія камедыі, серыялы "Забойная сіла" і "Вуліцы разбітых ліхтароў".

Калі зайшла размова пра амерыканскія баевікі, пераважная большасць вучняў выказала пажаданне значна зменшыць паказ крывавых сцэн і гвалту на тэлеэкране, але не выкідваць іх з сюжэтаў наогул, таму што баевікі вучаць самаабароне.

– Я лічу, што насілле на экране – гэта адмоўная з'ява, якой не павінна быць у такой колькасці, – сказала вучаніца з доўгімі валасамі, – бо гэта адмоўна ўплывае на дзяцей.

– А на вас не ўплывае? – пытаю ў яе.

– Ды што вы! Мы ўжо дарослыя, усё разумеем...

Але былі і такія, хто настойваў на тым, каб павялічыць колькасць крывавых матываў у сюжэтах фільмаў. На жаль, гэтыя падлеткі так і не змаглі растлумачыць, чаму яны так лічаць.

– Вам, напэўна, падабаецца назіраць за бойкай? – спрабую я дапамагчы хлопцу, які не можа знайсці аргумент.

– Падабаецца. Гэта прыгожа і цікава. Мне падабаецца, калі страляюць. І яшчэ цікава, як гінуць людзі. Гэта ж усім цікава, праўда?

Жудасна. Але няхай вас супакоіць тое, што пераважная большасць вучняў 9-га класа мела іншыя меркаванні. І каб канчаткова высветліць, адкуль бярэ свае вытокі вучнёўская агрэсія і прычым тут тэлевізар, я звярнулася да псіхолага А.А.Осіпавай.

– Алена Анатольеўна, скажыце калі ласка, як тэлебачанне ўздзейнічае на псіхіку дзіцяці?

— Калі ў дзіцяці няма структуры каштоўнасцей, тэлебачанне накладвае свой адбітак на тое, як гэта структура наладжваецца, на выбар прыярытэту. Калі ў сям'і прысутнічаюць пэўныя каштоўнасці і бацькі ўвесь час знаходзяцца побач з дзіцем, дапамагаюць яму разабрацца, то яно ўспрымае тое, што бачыць на экране, як кіно, якое не мае адносін да рэальнага жыцця. Калі ж дзіця знаходзіцца ў крымінагенным асяроддзі, калі сям'я не займаецца выхаваннем, тэлебачанне ўздзейнічае на псіхіку даволі моцна і можа стымуляваць агрэсію. Але заўсёды разумны дарослы здольны растлумачыць і дапамагчы, і ўздзеянне тэлебачання ў пэўнай ступені зменшыцца.

– Узрост адыгрывае пры гэтым нейкую ролю?

— Так. Дзіця малодшага школьнага ўзросту яшчэ не мае магчымасці самакіравання, і я думаю, што павінны быць пэўныя абмежаванні ў праглядзе тэлевізійных фільмаў і перадач для вучняў малодшых класаў. Дарэчы, дзеці, у якіх заніжаны інтэлектуальныя здольнасці, больш схільныя кіравацца чужымі думкамі і вызначаюцца большай падатлівасцю . Дзіця з вялікімі інтэлектуальнымі магчымасцямі здольнае ў большай ступені аналізаваць тое, што адбываецца і ў жыцці, і на тэлеэкране.

– Некаторыя настаўнікі сцвярджаюць, што менавіта тэлебачанне з'яўляецца адной з галоўных прычын агрэсіі вучняў у школе. Ці маюць яны рацыю?

— Я не думаю, што гэта адна з галоўных прычын. Тут трэба звярнуць увагу ў першую чаргу на самога настаўніка, на тое, што ён дазваляе сабе ў адносінах да вучняў: негатыўныя ацэнкі, грубыя словы. Калі гэта так, дык вучні такім жа чынам будуць рэагаваць і на яго асабіста. Настаўнікі часам самі правакуюць вучнёўскую агрэсію. Неяк мы праводзілі анкетаванне ў адной са школ, дык дзеці так і адказвалі: "Нашы настаўнікі – занадта эмацыянальныя, могуць крычаць без прычыны". З аднаго боку, гэта зразумела: настаўнік – звычайны чалавек са сваімі праблемамі. Але, з другога боку, кожнаму настаўніку трэба ведаць, ува што можа выліцца для яго няздольнасць кантраляваць свае эмоцыі.

Ці толькі адно тэлебачанне з яго шырокім спектрам баевікоў вінаватае ў агрэсіўнасці вучняў? Як я заўважыла, думкі псіхолага і саміх настаўнікаў разыходзяцца, і гэты факт дае падставу меркаваць, што прычыну агрэсіі ў першую чаргу трэба шукаць у іншым.

Магчыма. Я таксама схіляюся да думкі, што тэлебачанне не стымулюе агрэсію вучня ў той меры, як пра гэта гавораць. Але тады ўзнікае яшчэ адно пытанне: чаму 15-гадовым падлеткам падабаюцца сцэны гвалту і смерці на тэлеэкране? Што гэта: асаблівасці ўласнага густу і характару або ўсё ж-такі шкоднае ўздзеянне на псіхіку таго самага "злыдня", які завецца тэлевізарам?

А як лічыце вы, шаноўныя настаўнікі? Нам цікава даведацца пра вашы меркаванні. Чакаем лістоў.

Алена НОВІК.

Вниманию психологов, педагогов, врачей, социальных работников, менеджеров и других заинтересованных лиц!

Чем шире возможности, тем эффективней работа!

Институт практической психологии (ИПП) "Иматон" (г.Санкт-Петербург),

работающий над созданием национальных стандартов качества профессиональной подготовки психологов, разрабатывает сертифицированный психологический инструментарий и оказывает помощь по его практическому освоению, отработке навыков использования конкретных методов, техник, технологий, приемов.

Официальный представитель ИПП "Иматон" в Республике Беларусь
Центр психологии управления
Академии управления при Президенте Республики Беларусь
предлагает широкий выбор психологического инструментария.

Получить дополнительную информацию и оформить заказ можно по адресу:
220007, г.Минск, ул.Московская, 17, каб.1102, 1103, ежедневно, кроме выходных, с 9.00 до 17.00.

Тел. 222-75-80, факс 222-82-64 (с пометкой "Центр психологии управления").
E-mail: TK ~ 008 @ pacademy. edu.by

Тэхналогіі

Умею, ведаю, змагу!

Нядаўна на базе гэтай школы адбыўся семінар-практыкум па тэме "Развіццёвае навучанне: метады дзейнасці ўдзельнікаў эксперыменту". На ім ішла зацікаўленая размова пра напрацоўкі настаўнікаў - прыхільнікаў методыкі развіццёвага навучання, праблемы, якія сустракаюцца на практыцы, яе перавагі над традыцыйнай сістэмай навучання. Што новае ўносіць яна ў жыццё школы? Як ацэньваць веды вучняў, якія займаюцца ў класах па сістэме развіццёвага навучання? Якія перспектывы гэтай тэхналогіі? Чаму настаўнікі яе альбо прымаюць, альбо - не.

Скажам, у той жа сярэдняй школе №11 Барысава з 65 настаўнікаў па тэхналогіі развіццёвага навучання працуе толькі пятнаццаць чалавек, з сарака класаў школы - толькі дзесяць "развіццёвых": пачатковая ступень і часткова - сярэдняе звяно. Матэматыкі, напрыклад, пакуль катэгарычна адмаўляюцца працаваць па методыцы развіццёвага навучання з-за недастатковага метадычнага і псіхалагічнага забеспячэння.

На ўсе гэтыя пытанні падчас дыскусіі ўдзельнікі семінара пачулі адказы ад настаўнікаў-практыкаў, якія прадставілі, да таго ж, на суд гасцей чатыры адкрытыя ўрокі і іх самааналіз. Наталля Аляксееўна Паўлец правяла ўрок матэматыкі ў 2 "В" класе, урок рускай мовы ў першакласнікаў - Зоя Мікалаеўна Янучкоўская. Святлана Альбертаўна Несаява ўрок рускай мовы па тэме "Запазычаная лексіка" правяла ў 6 "Г". Як даследчыкі прыроды працавалі на ўроку прыродазнаўства пяцікласнікі з маладым настаўнікам Сяргеем Аляксандравічам Юзэфовічам, выпускніком школы (у якой ён сёння працуе) у роднай школе.

Цяжка было спачатку, расказвалі настаўнікі. А гэта было сем гадоў назад. Ля вытокаў стаялі энтузіясты. Адзін з іх - намеснік дырэктара па навучальнай рабоце Аляксандр Анатольевіч Макараў.

- Я б назваў той перыяд рамантычным, але ён хутка прайшоў, - гаварыў Аляксандр Анатольевіч. - Безумоўна, гэтая методыка захапляе і зачароўвае. Але ж адначасова яна патрабуе ад настаўніка глыбокай, напружанай працы над сабой, прафесіяналізму, удумлівага асэнсавання навуковай канцэпцыі тэхналогіі, што вельмі няпроста. Заўважу, чым далей - тым цяжэй. І сёння мы яшчэ не можам сказаць, што ў нас не існуе праблем. Правільна будзе сказаць, што мы яшчэ толькі вучымся. У школе працуе метадычнае аб'яднанне. Пачалі паступова выходзіць на аналітычную дзейнасць, адсочваем, што адбываецца з вучнем падчас яго вучобы, дынаміку яго развіцця. Дапамагае настаўнікам, а таксама бацькам прафесійны псіхолаг.

- Наша школа - звычайная, агульнаадукацыйная, - заўважыла Любоў Аляксандраўна Мікуліч, калі знаёміла гасцей з канцэпцыяй школы. - Побач - гімназія і політэхнічны каледж. Зразумела, што да нас прыходзяць вучні з розных сем'яў, кантынгент няпросты. Вось вы прысутнічалі на ўроку прыродазнаўства ў 5 "Б", які вёў наш выпускнік Сяргей Аляксандравіч Юзэфовіч. Ён - класны кіраўнік у пяцікласнікаў. Дык вось, палова вучняў з гэтага класа - бедныя дзеці. Многія з іх зведалі тое, чаго не зведаў за ўсё сваё жыццё іншы дарослы! (На жаль, такіх класаў у маёй школе многа!). А вы бачылі, якія гэтыя дзеці на ўроку? Якая прага да ведаў і бляск у вачах! Я сумняваюся, што яны былі б такімі, калі б вучыліся ў класе з традыцыйнай сістэмай навучання. Вось асабліва для такіх дзяцей сістэма развіццёвага навучання - выратаванне, шанс для ўдасканалення асобы. Развіццёвае навучанне - гэта методыка будучага. Я ў гэтым пераканана! І хто яшчэ сумняваецца - падумайце і паверце мне!

І на самай справе на ўроку прыродазнаўства ўсе пяцікласнікі аднолькава выдатна дэманстравалі кожны свой пазнавальны інтарэс, працавалі ў групах. Вучань на ўроку - актыўны суб'ект навучання. Настаўнік яго вядзе, а не ўзвышаецца над ім, стварае кожнаму сітуацыю поспеху. Вучні і настаўнік супрацоўнічаюць! Вядомы факт, што засваенне ведаў - працэс псіхалагічны, а значыць, цалкам індывідуальны. Вучань не зможа засвоіць тэму, пакуль сам не выканае пэўныя дзеянні. Сам! І для сябе! У гэтым - адзін з галоўных метадалагічных прынцыпаў методыкі развіццёвага навучання.

Вялікі рускі псіхолаг-гуманіст Л.С.Выгоцкі сцвярджаў, што "педагогіка павінна арыентавацца не на ўчарашні, а на заўтрашні дзень дзіцячага развіцця... Навучанне добрае толькі тады, калі яно ідзе наперадзе развіцця". Па Л.С.Выгоцкаму, засваенне ведаў, уменняў і навыкаў - не мэта навучання, а ўсяго толькі сродак развіцця вучня.

Псіхолаг сярэдняй школы № 9 Наталля Міхайлаўна Крышталь ласкава назвала методыку развіццёвага навучання самай усмешлівай, сонечнай, жартаўлівай. Методыкай, якая зніжае ўзровень трывожнасці вучняў, а значыць і працэнт захворванняў сярод іх. Вучні ў такіх класах, на яе думку, болей камунікатыўная, увогуле болей шчаслівыя. У шасцікласнікаў і сямікласнікаў не зніжаецца пазнавальны інтарэс, як гэта адбываецца ў традыцыйнай сістэме навучання.

Як жа ацэньваць веды вучняў у сістэме Д.Б.Эльконіна-В.В.Давыдава? Сёння гэта актуальная тэма для дыскусій і роздуму сярод навукоўцаў і практыкаў. (На семінары яна не была абыдзена ўвагай яго ўдзельнікаў). Большасць з іх апошнім часам схіляецца да думкі, што адзнака не адлюстроўвае поўнай карціны ведаў. Адзнака, былі такія думкі, можа быць выстаўлена і за старанне, і за акуратнасць. Ею можна захваліць, а можна пакараць. І калі ў традыцыйнай сістэме галоўным матывам навучання з'яўляецца адзнака, то ў сістэме Д.Б.Эльконіна-В.В.Давыдава адна з неабходных умоў - гэта навучанне без адзнак (безотметочное обучение), накіраванае на фарміраванне ў вучняў самаацэнкі як псіхалагічнай асновы ўмення вучыцца. Такая сістэма базіруецца на пазнавальным інтарэсе вучня, інтарэсе, які пасля становіцца галоўным унутраным матывам навучання. Што і пацвярджаюць практыкі.

Ці азначае адмаўленне ад адзнакі адмаўленне ад кантролю і ацэнкі ведаў вучняў з боку настаўніка? Безумоўна, не! Самаацэнка ператварае вучня ў суб'ект навучання, здольнага да самаразвіцця. Вучэбная самастойнасць малодшага школьніка, лічаць практыкі, пачынаецца са здольнасці зразумець: "гэта я ўжо ўмею і ведаю", а "гэтага я яшчэ не ведаю, але я зхачу ў гэтым у хуткім часе разабрацца".

Вучні ў развіццёвых класах маюць рэфлектыўныя дзённікі пад назвай "Мае поспехі і дасягненні", у якіх вядуць самакантроль і самаацэнку.

Пакуль у сярэдняй школе № 9 Барысава работа па ацэнцы ведаў вучняў без адзнак вядзецца ў эксперыментальным рэжыме. Такіх пляцовак у нашай краіне некалькі. Ёсць пэўныя цяжкасці, пра якія гаварыць пакуль не будзем. Пра канкрэтныя вынікі - раскажам пазней. А настаўнікам-эксперыментатарам пажадаем поспехаў.

Святлана БЕНЬ.

Школа, якую ўзначальвае Любоў Аляксееўна Мікуловіч - адна з дваццаці шасці эксперыметальных адукацыйных пляцовак у Барысаве. (Прычым, заўважу, сем з іх маюць статус эксперыментальных пляцовак рэспубліканскага ўзроўню). Педагагічны калектыў сярэдняй школы №11 працуе па апрабацыі праграмы "Здаровы лад жыцця" і "Жыццё без тытуню". Да таго ж, група настаўнікаў-энтузіястаў - шчырыя прыхільнікі методыкі развіццёвага навучання (сістэма Д.Б.Эльконіна і В.В.Давыдава). "Прымі, зразумей, даруй, падтрымай" - такі дэвіз педкалектыву гэтай навучальнай установы.

Сёлета настаўнікі ўзялі на сябе адказнасць і працуюць у рэжыме эксперыменту па навучанні вучняў без адзнак.

НА ЗДЫМКУ: дырэктар сярэдняй школы №9 Барысава Любоў Аляксееўна Мікуловіч.

Сачыненне на знаёмую мелодыю

Інтэграваны ўрок па тэхналогіі французскіх майстэрняў у 11 класе

Тэма ўрока: "Супастаўляльны аналіз мастацкага паказу працэсу калектывізацыі ў раманах М.Шолахава "Узнятая цаліна" і М.Зарэцкага "Вязьмо".

Мэты ўрока: прадоўжыць навучанне спосабам аналізу мастацкага твора; развіваць уменне бачыць характэрныя асаблівасці эпохі, працэсу калектывізацыі і асаблівасці стылю пісьменніка; фарміраваць у вучняў уменне праводзіць аналогію ў змястоўных, кампазіцыйных і моўных асаблівасцях твораў розных пісьменнікаў; садзейнічаць развіццю творчых здольнасцей і эстэтычнай культуры школьнікаў, уменню аргументавана выказваць свае думкі; выхоўваць грамадзянскую пазіцыю ў чытача, асабістае стаўленне да працэсу калектывізацыі.

Абсталяванне ўрока: партрэты М.Шолахава і М.Зарэцкага; ілюстрацыі да раманаў, якія адлюстроўваюць напружанасць правядзення працэсу калектывізацыі; магнітафон.

Ход урока:

I. Арганізацыйны момант. Настаўнік называе тэму і галоўную мэту ўрока – зразумець сутнасць погляду на пераломную эпоху ў гісторыі савецкага грамадства, эпоху калектывізацыі прадстаўнікоў двух братніх літаратур – рускай і беларускай, М.Шолахава і М.Зарэцкага.

Настаўнік чытае эпіграф да ўрока: "Такой вайны супраць уласнага народа гісторыя чалавецтва яшчэ не ведала. І, напэўна, самым жахлівым у гэтай вайне стала давядзенне да галечы вёскі, знішчэнне самага каштоўнага патэнцыялу – людзей-працаўнікоў".

Вучням прапануецца ўгледзецца ў твары на ілюстрацыях, уявіць, пра што думалі гэтыя людзі...

II. "Індукцыя". Праслухоўванне песні "Рускае поле" і вершаў С.Фёдарава "О Русь, моя" і С.Законнікава "Чорная быль" (урывак), якія ўводзяць у сістэму вобразаў урока.

III. Самаканструкцыя. Чытаем тэму ўрока, выдзяляем ключавое слова "калектывізацыя". Сшытак падзяляецца на дзве часткі і злева ствараецца асацыятыўны рад да гэтага паняцця, які ўзнік у вучняў у выніку прачытання двух раманаў – "Узнятая цаліна" і "Вязьмо".

У правай калонцы вучні ствараюць асацыятыўны рад, які адпавядае паняццю "калектывізацыя", у левай – што было канчатковай мэтай працэсу калектывізацыі для савецкага ўрада. Параўноўваючы потым асацыяцыі, якія атрымаліся (гора, слёзы, раскулачванне, страх, прымус, адплата, трагедыя душы – з аднаго боку, і калгас, ураджай, шчасце, дабрабыт, чалавечая годнасць – з другога), робім выснову пра глыбокую супярэчнасць гэтага працэсу.

IV. Сацыяканструкцыя (групавая работа).

Вучні дзеляцца на 5 мікрагруп. Кожная з іх павінна прыдумаць сабе назву, якая адлюстроўвае сутнасць пытання і адказаць на наступныя пытанні:

1. Як паказаны ў раманах "Узнятая цаліна" і "Вязьмо" праваднікі лініі партыі?

2. Як ставяцца да працэсу калектывізацыі народныя масы ў абодвух раманах?

3. Як у раманах паказаны працэс раскулачвання?

4. Як ставіцца да абагулення маёмасці селянін у абодвух раманах?

V. Сацыялізацыя. Кожная група паказвае і абараняе свой праект "Калектывізацыя". Падчас абароны мікрагрупе могуць задавацца пытанні астатнімі мікрагрупамі.

У пятую мікрагрупу ўвайшлі вучні, якія праводзілі паралелі па ўсіх чатырох пытаннях у рамане "Вязьмо".

Напрыклад, першая група "Лёс чалавека" выявіла характэрныя асаблівасці галоўнага праваднікa партыі ў перыяд суцэльнай калектывізацыі – Сямёна Давыдава. Пятая група "Цяжкія шляхі пазнання ісціны" параўнала гэты вобраз з вобразам Зеленюка ў рамане "Вязьмо", знайшоўшы шмат падабенства ў іх.

Другая група "Як гэта было" прадставіла свой праект у выглядзе дыялагічнай мовы. Вучні паказалі, як у рамане "Узнятая цаліна" падаюцца два першыя сходы, адзначыўшы іх рэзкае адрозненне (на першым сходзе прысутнічалі пераважна беднякі, якія ўсім сэрцам былі за стварэнне калгасаў, а на другім – сераднякі, якія вельмі сумняваліся ў правільнасці працэсу стварэння калгасаў).

Пятая група правяла аналогію ў апісанні масавых сцэн у рамане "Вязьмо", дзе паказаны вельмі складаны працэс "наставления середняка на путь истинный".

Трэцяя група называецца "Раскулачванне. Справядлівасць або пакараненне" паказала свой, вельмі цікавы праект у выглядзе спрэчкі двух сучаснікаў наконт самых шчымлівых старонак у рамане "Узнятая цаліна" – сцэн раскулачвання. Вучні робяць выснову пра бесчалавечнасць людзей, што рабілі гэта нібыта ў імя высакародных мэт.

Пятая група расказала пра аналагічныя эпізоды ў рамане "Вязьмо", у якіх апісваецца бязлітаснае стаўленне адных людзей да іншых, да тых, каго раскулачвалі, каго называлі "крывасмокамі".

Чацвёртая група "Насустрач будучаму або мінуламу..." прадставіла свой праект у выглядзе маналога-разважання пра вобраз серадняка Кандрата Майданнікава, які пакутліва пераадолеў бар'ер, што раздзяляў паняцці "маё" і "наша" і прыйшоў да высновы пра неабходнасць уступіць у калгас.

Прадстаўнікі пятай групы расказалі пра старонкі рамана "Вязьмо", дзе таксама апісваецца пакутлівае развітанне працаўніка са сваім канём. Робіцца выснова пра вялізную трагедыю душы чалавека-ўласніка, які спрабуе пераадолець сябе, свае былыя звычкі.

VI. Кульмінацыя творчага працэсу.

Пасля выступлення ўсіх груп даецца гістарычная даведка "Як гэта было", у якой прадстаўлены факты правядзення працэсу суцэльнай, стопрацэнтнай калектывізацыі.

Далей два вучні, якія рыхтавалі індывідуальныя заданні па выяўленні адметных рыс двух раманаў, адзначылі, што разам з вялікім падабенствам існуюць і адрозненні ў паказе працэсу калектывізацыі. Гэта, па-першае, храналагічная пабудова рамана "Узнятая цаліна" (чаго нельга сказаць пра раман "Вязьмо"), а па-другое, вялікае адрозненне ў гістарычных нацыянальных асаблівасцях рускага і беларускага народаў. Таму такі загартаваны, вопытны атрад дваццаціпяцітысячнікаў у рамане "Узнятая цаліна", а ў рамане "Вязьмо" магутны ідэйны праваднік лініі партыі адсутнічае.

VII. "Творчасць". Напісанне сачыненняў-мініяцюр па тэме ўрока пад мелодыю песні "Рускае поле".

VIII. "Рэфлексія". Зачытванне творчых работ. Кожны вучань расказвае пра свае светаадчуванне на кожным этапе ўрока.

Ніна ПАКЛОНСКАЯ,
настаўніца рускай мовы і літаратуры,
Раіса ШЫПАВА,
настаўніца беларускай мовы і літаратуры сярэдняй школы № 9 Жодзіна.

Вопыт

Почырк настаўніка

Матчына мова. Ці можа што-небудзь быць найдаражэй за яе?!

З калыскі ўвабрала Каця яе асалоду і прыгажосць. У хаце заўсёды гучала жывая гаворка. Яе цудадзейная сіла ўзбагачала душу.

Вучылася Каця ў вясковай школе, дзе ўсе прадметы вяліся на беларускай мове. Настаўнікі вельмі добра валодалі ёю, і Кацярына лавіла кожнае іх слова. Сярод аднакласнікаў дзяўчына вылучалася сваёй стараннасцю, сталасцю і сур'ёзнасцю.

Паспяхова закончыўшы сярэднюю агульнаадукацыйную школу, паступіла ў Мінскі педагагічны інстытут імя М.Танка на факультэт беларускай філалогіі і культуры. Многа часу праводзіла ў чытальнай зале інстытута, бібліятэках горада. Дапытлівасць, цяга да ведаў сталі асновай яе жыцця.

Пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС сям'я пераехала ў Слаўгарад.

Студэнцкія канікулы Кацярына праводзіць у Слаўгарадскай сярэдняй школе №1, дзе вучыліся яе брат, сястра, працавала маці. Хадзіла на ўрокі да настаўнікаў, якія выкладалі беларускую мову і літаратуру. Удасканальвала свае веды. Педпрактыку праходзіла ў тэтай жа школе. Давала неблагія ўрокі. Карысталася метадычнай літаратурай, навінкі якой набывала ў кнігарнях Мінска. Не абмінала кніжны магазін у Слаўгарадзе.

У яе – багатая дамашняя бібліятэка, вялікае месца ў якой займаюць творы беларускіх пісьменнікаў, шмат тлумачальных слоўнікаў... Заняла пачэснае месца і "Беларуская энцыклапедыя".

Пасля інстытута Кацярына па размеркаванні трапіла ў Слаўгарадскую сярэднюю школу №1.

Знаёмы педкалектыў, знаёмыя твары вучняў. Першы ўрок. Першыя крокі настаўніцтва. Хвалюючыя і радасныя хвіліны.

Нібы дзіўны, неўміручы набытак, перадае яна свае веды вучням. Як хваля шліфуе непадатлівыя камяні, так шліфуе ў кожнага вучня веданне беларускай мовы Кацярына Пятроўна.

Выкладае яна родную мову ў 6-х і 8-х класах. Стала любімай настаўніцай, пра што гавораць анкеты вучняў. Індывідуальна працуе з кожным, заахвочвае дзяцей. Не палохае іх нездавальняючымі адзнакамі, а вучыць працаваць самастойна.

У рабоце ёй вельмі дапамагаюць часопісы "Роднае слова" і "Беларуская мова і літаратура", якія сталі для яе настольнымі.

Каб рыхтаваць дыдактычны матэрыял да ўрока, грунтоўна асвоіла камп'ютэр. Не лічыцца з часам. Гадзінамі робіць карткі, складае канспекты заняткаў. Таму ўрокі ў яе праходзяць жыва і цікава. Вучні з нецярплівасцю чакаюць Кацярыну Пятроўну.

Завуч школы Таццяна Анатольеўна Мартынава вельмі цэніць гэтую настаўніцу. Часта бывае ў яе на ўроках. Дарэчы, яна таксама выкладае беларускую мову і літаратуру. Вось як Таццяна Анатольеўна ахарактарызавала Кацярыну Пятроўну: "Кацярына Пятроўна Чухарава ўжо трэці год працуе, выкарыстоўваючы элементы тэхналогіі поўнага засваення ведаў. У восьмым класе матэрыял падае блокамі, якія аб'ядноўваюцца ў вучэбныя адзінкі.

Першы ўрок – тлумачэнне тэмы, другі – дыягностыка і карэкцыя, трэці – паглыбленне ведаў.

На кожным уроку перад вучнямі – карткі з тэмай і мэтай урока па вучэбнай адзінцы, да якіх яны звяртаюцца ў час работы. Веды ў школьнікаў глыбокія, трывалыя", дзеці працуюць ва ўзроставых групах. Гэта дае магчымасць усім засвоіць матэрыял больш поўна і грунтоўна, паглыбляючы свае веды. Кожны працуе з заданнем зыходзячы са свайго ўзроўню падрыхтаванасці.

У Кацярыне Пятроўне спалучаюцца знешняя прывабнасць і эрудыцыя, прастата і інтэлігентнасць, патрабавальнасць і дабрыня, а галоўнае – яна мае вялікую любоў да дзяцей.

Браніслава БАЙВЕР.

Прадстаўляем напрацоўкі К.П.Чухавай па беларускай мове для 8-га класа:

Тэма "Прыназоўнік"

Другі ўзровень (базавы)

1. Вызначыць граматычнае значэнне прыназоўнікаў.

Родам з Міншчыны, дэлегаты з завода, вылеплены з гліны, вянок з кветак, слоік з-пад малака, ключ ад свірна, заўзятасць да працы, тэма для сачынення, белы ад снегу, прыдатны для пісьма, выйсці з лесу, гатовы ў дарогу, пайшоў у навуку, хутчэй за ўсіх, садок перад хатай.

2. Падкрэсліць словы вакол, насустрач, побач, пасля ў ролі прыслоўя адной рыскай, а ў ролі прыназоўніка - дзвюма.

1. Пачынала днець, ужо добра было відаць вакол. 2. Вакол руін - некалькі старых клёнаў, ліп, дубоў. 3. Побач нікога не было. 4. А побач дарогі - чыстае поле. 5. Хутка пабегла насустрач набярэжная. 6. Па лясной сцяжынцы насустрач нам ішлі тры чалавекі. 7. Пасля мітынгу людзі ўсклалі вянкі да абеліска. 8. Пасля ён наведаў свайго сябра.

3. Пабудаваць прыназоўнікавыя словазлучэнні з наступнымі граматычнымі значэннямі: дзеянне і месца, дзеянне і час, дзеянне і прычына, прымета прадмета па велічыні (паводле колеру, матэрыялу).

Трэці ўзровень (высокі)

1. Спісаць, раскрываючы дужкі. Растлумачыць напісанне выдзеленых слоў.

1. (У) пачатку лістапада ўстанавілася дажджлівае надвор'е. 2. Доўгія сумёты ляглі (ў) поперак дарогі. 3. Вароны (з) шумам падняліся (ў) гору і паляцелі (ў) бок лесу. 4. Маці выбегла (на) сустрач сыну. 5. (На) выпадак дажджу сена клалі ў копы.

2. Скласці сказы з аманімічнымі парамі.

Да хаты - дахаты, з верху - зверху, з усім - зусім, у дзень - удзень, у дзвюх - удзвюх.

3. Пабудаваць словазлучэнні.

Выканаць згодна (рашэнне), гаварыць па (тэлефон), кінуцца наперарэз (конь), пісаць па (правілы).

4. Запісаць словазлучэнні, якія з'яўляюцца нормай для беларускай мовы.

Больш яго, большы за яго; жартаваць над ім, жартаваць з яго; збірацца ў грыбы, збірацца за грыбамі; ісці па ваду, ісці за вадой, хварэць грыпам, хварэць на грып.

5. Пабудаваць словазлучэнні з састаўнымі прыназоўнікамі зыходзячы з, згодна з, нягледзячы на, пачынаючы з, у выніку, у сувязі з. Для якога стылю мовы яны характэрныя?

Тэма "Прыслоўе"

Другі ўзровень (базавы)

Спішыце, раскрываючы дужкі. Выдзеленыя словы разбярыце па саставу.

(Н...) прыкметна пачыналася восень. Яшчэ гарача свяціла сонца, зусім (па) летняму весела свісталі дразды. У **палісадніках** (на) перагонкі (н...) кідка хваліліся сваёй прыгажосцю жоўтыя вяргіні і астры. Але ўсеўладная (н...) адступна цікавала ўжо летам. Яна (з) лёгку **пасерабрыла** бярозы.

Ужо (н...) надта высока ў небе марудна плыве сонца, шчодра лье на зямлю цяпло. Цёпламу дню (па) свойму радуецца кожная жывая істота. Цінькаюць бесклапотна сініцы, імкліва несяцца ўсюды ластаўкі. (Е...) куды спяшаючыся, (у) верх па сцяблінцы паўзе божая кароўка. Кругом пахне салодкай медуніцай... (Паводле І.Навуменкі).

Трэці ўзровень (высокі)

Спішыце, пастаўце коскі падкрэсліце члены сказа выражаныя прыслоўямі, вызначце, ад якіх часцін мовы яны ўтвораны

Завіруха бушавала ноччу і днём. Здавалася не будзе канца яе лютай сіле яе злоснаму завыванню. На вуліцы як і раней мітусіўся снег. Яго белая заслона пакрыве закрывала будынкі і дрэвы. Навокал усё гуло трэлася выла скуголіла...

Ад вечар завея аціхла. **Нізкія воблакі шчодра пасыпаўшы снегам зямлю падняліся вышэй.** На вуліцы стала хораша. Ужо налыходзіў вечар. І толькі цяпер перад вачамі найпрыгажэй раскрываўся малюнак таго што натварыла завіруха. Каля будынкаў і ўзгоўж платоў ляжалі горы снегу. (Паводле Я.Коласа)

Знайдзіце вышэйшую і найвышэйшую ступені параўнання ў тэксце.

Выдзелены сказ разбярыце па членах сказа, выпішыце з яго словазлучэнні з прыслоўем, абазначце галоўнае слова.

Урокі матэматыкі - магічнае майстэрства

Сярэдняя агульнаадукацыйная школа № 20 у Ленінскім раёне Брэста. На першы погляд - самая звычайная. А калі больш уважліва прыгледзішся, то заўважаеш, што школьнае жыццё тут замешана на творчасці, высокім прафесіяналізме, супрацоўніцтве настаўнікаў, вучняў і бацькоў.

Слова "mathema" мае грэчаскае паходжанне і перакладаецца як "веды", "навука". І як тут не згадаць словы вядомага фізіка-тэарэтыка Віктара Вайскопфа: "Зямля трымаецца на двух кітах: пачуццях і ведах, але пачуцці без ведаў – малаэфектыўныя, а веды без пачуццяў – бесчалавечныя". Вось і ў брэсцкай школе № 20 урокі матэматыкі, пазакласная работа па прадмеце ператвараюцца ў сапраўднае магічнае мастацтва.

На базе школы працуе творчая група настаўнікаў матэматыкі Ленінскага раёна. Аснову групы складаюць настаўнікі вышэйшай і першай катэгорыі.

Узнікненне цікавасці да матэматыкі ў значнай колькасці вучняў у вялікай ступені залежыць ад методыкі яе выкладання. Настаўнікі школы робяць усё магчымае, каб на ўроках кожны вучань працаваў актыўна і захоплена, яны даюць не толькі веды, але і вучаць школьнікаў творча выкарыстоўваць іх.

11 "В" клас. Абагульняльны ўрок па тэме "Лагарыфмічная функцыя". Вядзе яго настаўнік матэматыкі вышэйшай катэгорыі Эма Вацлаваўна Манюк.

Урок пачаўся з вуснай работы, у ходзе якой было запланавана рашэнне творчых задач, накіраваных на актывізацыю разумовай дзейнасці вучняў. Вучні пастаўлены ва ўмовы, у якіх вымушаны пастаянна аналізаваць, параўноўваць, рабіць высновы. Гэтая частка ўрока прыводзіць у сістэму ўсе веды, неабходныя для трывалага засваення матэрыялу. Заданні – незвычайныя, але даступнага ўзроўню складанасці. Усё гэта дазваляе настаўніку сканцэнтраваць увагу класа на канкрэтнай праблеме.

Другі этап – этап актуалізацыі ведаў. Для рашэння вучням прапануюцца лагарыфмічныя ўраўненні і няроўнасці. Гэтая работа вельмі сур'ёзная і патрабуе не выпускаць з поля зроку ніводнага вучня класа. Нават тыя, хто адчувае цяжкасці, пасля разбору рашэння задач, бачаць, што маглі зрабіць гэта самастойна.

Трэці этап урока – самастойная работа па вызначэнні зоны развіцця вучня. Школьнікам прапануюцца тэставыя заданні.

Потым чацвёрты этап – самастойная работа па ўзроўнях. Кожны вучань выбірае заданні пэўнага ўзроўню з трох прапанаваных. Усяго тры ўзроўні. Эма Вацлаваўна тлумачыць: "Першы ўзровень засваення – рэпрадуктыўны. Ён прадугледжвае, што вучань можа паўтарыць азначэнне, знайсці ў табліцы або на плакаце патрэбныя формулы, можа рашыць па зададзеным алгарытме просты прыклад. Такі ўзровень засваення матэрыялу ацэньваецца адзнакай "3".

Другі ўзровень засваення – канструктыўны. Вучань можа тлумачыць, прыводзіць прыклады, рабіць высновы, абгрунтоўваць, вызначаць узаемасувязь. Пры такім узроўні ведаў у базавых класах ставіцца адзнака "4" або "5", у залежнасці ад значнасці вывучанага матэрыялу, яго складанасці і індывідуальных асаблівасцей вучня. Трэці ўзровень засваення таго ж аб'ёму матэрыялу прадугледжвае свабоднае яго выкарыстанне для вырашэння праблемных сітуацый, выкананне творчых заданняў. Гэта ўзровень глыбокага і асэнсаванага засваення прадмета. Веды такога ўзроўню ў базавых класах ацэньваюцца адзнакай "5".

Дамашняе заданне таксама прапануецца ў трох варыянтах.

Урокі настаўніцы матэматыкі А.В.Маёравай прываблываюць ідэямі супрацоўніцтва, сатворчасці.

Асабліва ўдаюцца Алене Васільеўне інтэграваныя ўрокі. Яны валодаюць выразнай прыкладной накіраванасцю і выклікаюць несумненную пазнавальную цікавасць.

Ніна Фёдараўна Кавальчук кіруе работай метадычнага аб'яднання настаўнікаў матэматыкі сярэдняй школы № 20. Гэты настаўнік актыўна выкарыстоўвае ў сваёй працы нетрадыцыйныя формы навучання. Яе ўрокі даюць дастатковы пажытак для разумовай дзейнасці вучняў, матэматычны змест даступны ўспрыняццю школьнікаў. У ходзе ўрока яна выкарыстоўвае гістарычныя экскурсы, навукова-папулярныя апавяданні, урыўкі з літаратурных твораў. Выкарыстанне даследчых задач стымулюе распрацоўку вучнямі гіпотэз, правядзенне даследаванняў. Уключаючы ва ўрок гульневыя моманты, настаўнік раскрывае цікавыя бакі матэматыкі, здымае з яе арэол цяжкага прадмета.

У сярэдняй школе № 20 сёння вядзецца эксперыментальная работа па апрабацыі модульнага навучання пад кіраўніцтвам прафесара П.І.Трацякова. Намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце, настаўнік матэматыкі В.В.Ніканчук тлумачыць: "Класна-ўрочная сістэма характарызуецца шматпрадметнасцю і нізкай частотнасцю вучэбных прадметаў, што прыводзіць да пастаяннай перагрузкі вучняў і настаўнікаў. Айчынная практыка паказвае перспектыўнасць модульнага навучання, якое характарызуецца апераджальным вывучэннем тэарэтычнага матэрыялу вялікімі блокамі-модулямі, алгарытмізацыяй вучэбнай дзейнасці, завершанасцю і зладжанасцю цыклаў пазнання. Паўзроўневая індывідуалізацыя вучэбнай дзейнасці і дыферэнцыяцыя навучання стваракуць сітуацыю выбару для настаўніка і вучня і забяспечваюць выпускнікам магчымасць далейшай паспяховай самаадукацыі і прафесійнай адукацыі".

Сярэдняя агульнаадукацыйная школа № 20 Брэста – гэта школа творчасці. Сюды прыходзяць на практыку студэнты, настаўнікі, якія павышаюць сваю кваліфікацыю. На базе школы адбываюцца шматлікія семінары па сучасных праблемах навучання. Частымі гасцямі школы з'яўляюцца педагогі з-за мяжы.

Алена ГРЫНЬКО,
метадыст Брэсцкага абласнога інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі.

Тэлепраграма

ПАНЯДЗЕЛАК, 10 СНЕЖНЯ
БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.35 Навіны.
6.10, 7.10, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
9.15 "Страсці".
10.00 Арсенал. Праграма пра армію.
10.30 Тэлебарометр. Прагноз надвор'я.
11.00 "Сямейныя вузы".
12.15 "На скрыжаваннях Еўропы". Тэлефестываль беларускай песні.
13.00 "Строгавы". Маст. фільм. 1-я серыя.
14.10 "Вясёлка над Віцебскам". Вакальна-харэаграфічны ансамбль "Малая зямля Жывецкая".
14.30 "Скарбы сусветнай культуры".
15.15 "Жулі Леско".
16.45 "Вялікія жанчыны стагоддзя". Фільм "Джэйн Фонда".
17.10 "Страсці".
18.25 Зона Ікс.
18.35 "Фландрыйскі сабака". Прыгонніцкі фільм.
20.20 "Дзіўная гісторыя, падобная на казку". Публіцыстычная праграма.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 "Сямейныя вузы".
22.40 Стадыён.
23.05 Планета "АРТ".
23.50 Начны сеанс. "Аголеная Маха".

ГРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00 Навіны.
8.15 "Зямля кахання".
9.15 Што? Дзе? Калі?
10.20 Дак. дэтэктыў "Алмазны ланцуг". Справа 2001 года.
10.50 Бібліяманія.
16.00 Вялікае мыццё.
17.25 "З лёгкай парай!".
18.00 Чакай мяне.
19.00 "Хто хоча стаць мільянерам?".
20.00 Час.
20.35 "Прыпынак па патрабаванню".
21.45 Незалежнае расследаванне.
22.30 Начны "Час".
23.00 "На футболе".
23.30 "Начная змена".

РАСІЯ

16.00, 19.00 Весткі.
16.30 Прыгодніцкі фільм "Няўлоўныя мсціўцы".
18.00 "Агенцтва НЛС".
19.35, 22.30 Мясцовы час. Весткі-Масква.
19.55 Дэтэктыў "Пуаро Агаты Крысці. Помста".
22.00 Весткі + Падрабязнасці.
22.45 Вострасюжэтны фільм "Катала".
0.15 Прагноз надвор'я.

КУЛЬТУРА

7.05, 11.30, 15.00, 17.30, 23.00 Навіны культуры.
7.30 "Цені забытых продкаў". Маст. фільм.
9.15 "Бясконцая гісторыя Галіўда".
9.40 Дак. фільмы.
10.35 Сферы.
11.45 Культурная рэвалюцыя.
12.35 "Анталогія аднаго верша".
12.40, 20.40 Маст. кароткаметражныя фільмы.
13.30 Разам з Фафалем.
13.45 Усе суры Карана.
14.05 Жывое дрэва рамёстваў.
14.15 Архітэктурная галерэя.
14.30 "Восеньскія партрэты".
15.10 "Гатовыя ці не".
15.35 "Усё ўладзіца".
16.30 Alma Mater.
17.00 Археалогія.
17.50 "Рэпін малое Талстога". Дак. фільм.
18.05 Юбілейны вечар С. Дарэнскага.
21.35 "Што рабіць?".
22.30 Ад кінаавангарда да відэаарта.

НТБ

5.00, 5.30, 6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00, 23.05 Сёння.
5.15, 6.20, 7.55 14.40, 17.35 Крымінал.
5.20, 7.15 У запас.
5.35, 6.40, 14.30 Афіша.
5.40, 7.25 Нашы любімыя жывёлы.
5.45, 6.45, 7.50 Пяць хвілін з Наважонавым.
5.50, 8.50 Вялікія грошы.
6.35, 7.40 Карданны вал.
8.25 Служба выратавання.
9.25 Надоечы.
10.40 Лялькі.
11.25 "Паліцэйскія".
13.20 Ток-шоу "Прынцып "Даміно".
15.30 "Мужчынская работа".
18.30 Герой дня.
18.50 "Растоў-тата".
20.00 Сквапнасць.
21.50 "Хуткая дапамога".
23.35 Гардон.

СТБ

6.30, 16.30 "Ікс-мэн".
6.30, 16.00 "Шкадлівы сабака".
7.00 "Шалёны Джэк-пірат".
7.30, 15.30 "Мурашкі".
8.00 Інфармацыйная праграма "168 гадзін Мінска".
8.50, 23.30 "Віртуальны свет".
9.00 Псіхалагічная драма "Любімая дачка".
1.05 "Паралелі".
11.30 "Вялікае снеданне з Лікай".
12.00, 15.00, 18.00 Навіны СТБ.
12.15 "Выпадковы сведка".
12.45, 13.55 "Дальнабойшчыкі".
15.15, 23.40 "М 1". Музычная праграма.
16.55 "Чарцяня".
18.15 Міжнародныя спартыўныя навіны на СТБ.
18.30 "Хіт-момант – вячэрняя рапсодыя".
19.00 "Тэма дня". Аўтарская праграма Сяргея Вінаградава.
19.10 "Прэм'ер-парад". Сталічны".
19.15 "Вечарніца".
19.30 Фільм жахаў. "Кракадзіл".
21.40 "Медыкі".
23.00 "Навіны СТБ-24 гадзіны".
0.00 Футбольны кур'ер.

ТБ 6

5.45, 14.40, 17.40, 23.35 Дарожны патруль.
6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 12.00, 14.00, 16.00, 18.00, 20.00 Цяпер.
6.10, 6.40, 7.10, 7.35 Дзень за днём.
7.50 Назло.
8.25 Фільм "Прыйдзі і вазьмі".
10.20 "Жанчына з характарам".
11.35 "Усяго".
12.20, 14.25 Тэлемагазін у Мінску.
13.20 "Самыя гучныя злачынствы XX стагоддзя".
15.00 100 цудаў свету. "Тыгры снягоў".
16.30, 18.45 "Вуліцы разбітых ліхтароў III".
20.40 Тушыце святло.
20.55 "Страсці па Нобелю".
22.00 Грані.
22.45 "Салаўіная ноч".

АЎТОРАК, 11 СНЕЖНЯ
БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

Тэхнічная прафілактыка да 15.00.
15.00, 18.00, 0.20 Навіны.
15.15 "Дзні, раскажы мне гісторыю".
15.25 "Казкі бацькі Кастора-2".
15.40 "Маленькія Эйнштэйны".
16.10 "Пяць цудаў".
16.20 "5 х 5". Інфармацыйна-забаўляльная праграма для старшакласнікаў.
17.00 "Страсці".
18.25 Зона Ікс.
18.35 "Масква--Мінск".
19.00 "Маленькая Фадэта". Маст. фільм.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Камедыйная меладрама "Нічога пра Рабера".
23.30 Спорт-кур'ер.
23.40 "Чатыры танкісты і сабака". Маст. фільм.
0.35 Валейбол. Top teams cup. Мужчыны. "Гомельскі валейбольны клуб" (Беларусь) — "Эшпіньо" (Партугалія).

ГРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00 Навіны.
8.15 Чакай мяне.
9.15 Смехапанарама.
9.40 "Хто хоча стаць мільянерам?".
10.35 "Бесталковыя нататкі".
10.50 Бібліяманія.
15.00, 20.35 "Прыпынак па патрабаванню".
16.00 Вялікае мыццё.
17.25 "Паскораная дапамога".
18.00 "Зямля кахання".
19.00 Апошні герой. "Змова".
20.00 Час.
21.40 Крэмль-9. "Чыста партыйнае забойства".
22.30 Начны "Час".
23.00 Цывілізацыя.
23.30 "Начная змена".

РАСІЯ

8.00, 10.00, 16.00, 19.00 Весткі.
8.15, 18.00 "Агенцтва НЛС".
10.30 "Санта-Барбара".
16.30 Прыгодніцкі фільм "Новыя прыгоды няўлоўных".
19.35 Мясцовы час. Весткі--Масква.
19.55 Ала Пугачова. "Успаміначы Калядны...".
22.00 Фільм "Камедыя строгага рэжыму".
23.40 Эрык Клэптан, Сьюзан Сарандон, Мік Джагер, Элтан Джон і Джым Кэры ў дабрачынным канцэрце, прысвечаным ахвярам трагедыі 11 верасня і гораду Нью-Йорку.
1.25 Прагноз надвор'я.

КУЛЬТУРА

7.05, 11.30, 15.00, 17.30, 23.00 Навіны культуры.
7.30, 20.40 "Спадарожнік". Маст. фільм.
8.50 Мультфільмы.
9.15 Залаты п'едэстал.
9.40, 15.35 Дакументальны экран.
10.35 У вашым доме.
11.45 "Легенды дзікай Поўначы".
13.30 Разам з Фафалем.
13.45 Справа жыццёвая.
14.15 Улада факта.
14.30 Сцэнаграма.
15.10 "Гатовыя ці не".
16.30 "Расійскі кур'ер".
17.00 Археалогія.
17.50 Дварцовыя тайны.
18.15 "Каханне на Зямлі".
19.45 Добрай ночы, малышы!
20.00 Выпадак на станцыі Качатоўка". Монаспектакль.
21.55 З музычнай калекцыі тэлеканала "Культура".
22.35 Форма.

НТБ

5.00, 5.30, 6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00, 23.05 Сёння.
5.15, 6.20, 14.40, 17.40 Крымінал.
5.20, 7.15 У запас.
5.35, 6.40, 14.30 Афіша.
5.40, 7.25 Нашы любімыя жывёлы.
5.45, 6.45, 7.45 Пяць хвілін з Наважонавым.
5.50, 6.50 Вялікія грошы.
6.35, 7.40 Карданны вал.
7.55, 21.50 "Хуткая дапамога".
9.25, 20.00 Сквапнасць.
10.10 Шоу Алены Сцепаненка.
11.25 "Паліцэйскія".
13.20 Ток-шоу "Прынцып "Даміно".
15.30 "Графіня дэ Мансаро".
16.30, 18.50 "Растоў-тата".
18.35 Герой дня.
23.30 Гардон.

СТБ

6.00, 16.30 "Ікс-мэн".
6.30, 16.00 "Шкадлівы сабака".
7.00 "Шалёны Джэк-пірат".
7.30, 15.30 "Мурашкі".
8.00, 18.15 Міжнародныя спартыўныя навіны на СТБ.
8.15 Навіны СНД.
8.30, 18.45 "Аўтапанарама".
8.45, 19.10 "Прэм'ер-парад "Сталічны".
8.50, 23.30 "Віртуальны свет".
9.00 Трылер "Кошкі-мышкі".
11.30 "Скрыжаванне". Музычна-забаўляльная праграма.
12.00, 15.00, 18.00 Навіны СТБ.
12.15 "Выпадковы сведка".
12.45, 22.00 "Медыкі".
14.00 "Сакрэтныя матэрыялы".
15.15, 1.40 "М 1". Музычная праграма.
16.55 "Чарцяня".
18.30 "Дзень добры, доктар!".
19.00 "Тэма дня". Планёрка ў мэрыі.
19.15 "Вечарніца".
19.30 Камедыя "Садоўнік Шанс".
23.00 Навіны "СТБ-24 гадзіны".
23.45 Псіхалагічная драма "Нож у вадзе".

ТБ 6

5.45, 14.40, 17.40, 23.35 Дарожны патруль.
6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 12.00, 14.00, 16.00, 18.00, 20.00 Цяпер.
6.10, 6.40, 7.10, 7.35 Дзень за днём.
7.50 Назло.
8.25, 20.50 Фільм "Страсці па Нобелю".
9.15, 12.20, 14.25 Тэлемагазін у Мінску.
9.25 "Без гальштука".
10.20 "Жанчына з характарам".
11.30 Катастрофы тыдня.
13.20 "Самыя гучныя злачынствы XX стагоддзя".
15.00 100 цудаў свету. "Народжаная з агню".
16.30, 18.45 "Вуліца разбітых ліхтароў III".
22.00 Грані.
22.45 "Без пратакола".

СЕРАДА, 12 СНЕЖНЯ
БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.35 Навіны.
6.10, 7.10, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
9.10 "Страсці".
10.00 Здароўе. Тэлечасопіс.
10.30 "Маленькія Эйнштэйны".
11.00 "Сямейныя вузы".
12.15 Добры дзень, Беларусь!
13.05 "Строгавы". Маст. фільм. 2-я серыя.
14.15 Дак. серыял "Скарбы сусветнай культуры".
14.30 Час мясцовы. Рэпартажы з правінцыі.
15.15 "Дзні, раскажы мне гісторыю".
15.25 "Казкі бацькі Кастора-2".
15.40 "Маленькія Эйнштэйны".
16.10 "Пяць цудаў".
16.20 "5 х 5". Інфармацыйна-забаўляльная праграма для старшакласнікаў.
17.00 "Страсці".
18.25 Зона Ікс.
18.35 Гадзіна прафесіянала.
19.05 Маст. фільм "Летнія людзі".
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.45 "Сямейныя вузы".
22.40 Спорт-кур'ер.
22.50 "Чатыры танкісты і сабака". Маст. фільм.
23.50 Крымінальнае дасье.
0.15 "Сустрэча ў Траецкім" з Аляксандрам Дамарацкім.
0.40 Бокс. Адкрыты Кубак беларусі. Фіналы.

ГРТ

8.10 Іграй, гармонік любы!
8.50 Бібліяманія.
9.00, 14.00, 17.00 Навіны.
9.10 Дэтэктыў "Знайсці і абязшкодзіць".
10.50 "Самі з вусамі"
11.20 Фільм "Жорсткі раманс".
14.10 "Куміры". Выпрабаванне славай".
14.45 "Слабае звяно".
15.40 Фільм "Масква слязам не верыць". 1-я серыя.
17.15 "Масква слязам не верыць". 2-я серыя.
18.50, 20.35 Ала Пугачова, Філіп Кіркораў, Сафія Ратару і іншыя ў святочным канцэрце.
20.00 Час.
22.00 Трылер "Затворнік".
23.45 Прыгодніцкі фільм "Тарас Бульба".

РАСІЯ

7.55 Тата, мама, я – спартыўная сям'я.
8.40 "Гарадок".
9.20 Добрай раніцы, краіна.
10.00 "Сто да аднаго".
10.50 Канцэрт Алега Газманава "Мы разам".
12.30, 13.20 Фільм "Зімняя вішня".
13.00, 19.00 Весткі.
14.30 Фільм "Зімняя вішня-2".
16.05 Фільм "Зімняя вішня-3".
19.25 Аншлаг. "Падмаскоўныя канікулы".
22.30 Фільм "Пяшчотны ўзрост".
0.40 Прагноз надвор'я.

КУЛЬТУРА

9.10 "Аўтамабіль, скрыпка і сабака Клякса". Маст. фільм.
10.45 Цыркавы чамадан.
11.15 "Самы маленькі гном".
11.25 Цуды надвор'я.
11.50 "Сто дзён пасля дзяцінства". Маст. фільм.
13.30, 21.00 Навіны культуры.
13.45 Кінаканцэрт.
14.05 "Белы снег Расіі". Маст. фільм.
15.30 "Лебедзі Непрадвы". Мультфільм.
15.55 "Святло далёкай зоркі".
16.50 "Жыццё — боцік нянарны". Дак. фільм.
17.50 Алібек Днішаў і ОРНІ пад кіраўніцтвам Н. Някрасава ў Канцэртнай зале імя П. Чайкоўскага.
18.30 "Сам-насам з Пятром Вялікім".
19.00 "Сола для гадзінніка з боем". Спектакль.
21.20 Асабістыя ўспаміны пра вялікае жыццё.
21.25 Смеханастальгія.
21.50 "Па галоўнай вуліцы з аркестрам". Маст. фільм.

НТБ

5.30 Прыгодніцкі фільм "Дзеці капітана Гранта".
7.00, 9.00, 11.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сёння.
7.10 Камедыя "Не гаруй".
9.20 Адчыніце, міліцыя!
10.40 Смачныя гісторыі.
11.25 Камедыя "Каму я вінаваты – усім дарую".
13.05 Творчы вечар Льва Наважонава.
14.35 15.20 Фільм П. Лабкова "Маўзалей".
16.05 Дэтэктыў "Шынок на Пятніцкай".
18.40 Баявік "У смяротнай небяспецы".
21.40 Фільм "Каралева Марго".

СТБ

6.00, 16.30 "Ікс-мэн".
6.30, 16.00 "Шкадлівы сабака".
7.00 "Шалёны Джэк-пірат".
7.30, 15.30 "Мурашкі".
8.00, 18.15 Міжнародныя спартыўныя навіны на СТБ.
8.15 Навіны СНД.
8.30 "Снеданне з Лікай".
8.35 Музыка на СТБ.
8.45, 19.10 "Прэм'ер-парад "Сталічны".
8.50, 23.15 "Віртуальны свет".
9.00 Камедыя "Садоўнік Шанс".
11.35, 1.40 "М 1". Музычная праграма.
12.05, 15.00, 18.00 Навіны СТБ.
12.40, 21.50 "Медыкі".
14.00 "Бафі".
16.55 "Чарцяня".
18.30 "Радыёкропка". Музычна-забаўляльная праграма.
19.00 "Тэма дня". Аўтарская праграма Сяргея Вінаградава.
19.15 "Вечарніца".
19.30 Крымінальная меладрама "Каханне і панажоўшчына".
23.00 Навіны "СТБ-24 гадзіны".
23.30 Трылер "Агіда".

ТБ 6

5.35, 0.20 Дарожны патруль.
5.55 Фільм "Лекс і Роры".
7.35, 21.00 Фільм "Страсці па Нобелю".
8.35, 22.15 Тушыце святло.
8.50 Фільм "Пагранічны сабака Алый".
10.00, 14.00, 18.00 Цяпер.
10.25 "Жанчына з характарам".
11.30 Фільм "Чалавек-амфібія".
13.25 "Самыя гучныя злачынствы XX стагоддзя".
14.25 100 цудаў свету." Гісторыя грузінскага віна".
15.10 "Такое смешнае жыццё".
16.05 Фільм "Афіцэры".
18.50 Фільм "Вясёлле".
22.30 Фільм "Апусканне ў бездань".

ЧАЦВЕР, 13 СНЕЖНЯ
БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.30 Навіны.
6.10, 7.10, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
9.15 "Страсці".
10.00 Тэлевітамін.
10.30 "Маленькія Эйнштэйны".
11.00 "Сямейныя вузы".
12.15 Добры дзень, Беларусь!
13.05 "Строгавы". Маст. фільм. 3-я серыя.
14.15 "Скарбы сусветнай культуры".
14.30 Сутнасць. Духоўная праграма.
15.15 "Дзні, раскажы мне гісторыю".
15.25 "Казкі бацькі Кастора-2".
15.40 "Маленькія Эйнштэйны".
16.10 "Пяць цудаў".
16.20 "5 х 5". Інфармацыйна-забаўляльная праграма для старшакласнікаў.
17.00 "Страсці".
18.20 Зона Ікс.
18.30 Ш. Стоун у сямейнай меладраме "Волат".
20.15 Лёс чалавека. Пётр Квіцінскі.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.45 "Сямейныя вузы".
22.35 Спорт-кур'ер.
22.45 "VIP".
23.45 Каралеўскае паляванне.

ГРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00 Навіны.
8.15 "Зямля кахання".
9.10 "З лёгкай парай!".
9.40 "Хто хоча стаць мільянерам?".
10.35 "Бесталковыя заметкі".
10.50 Бібліяманія.
15.00 "Прыпынак па патрабаванню".
16.00 Вялікае мыццё.
17.25 Смехапанарама.
18.00 "Зямля кахання".
19.00 "Слабае звяно".
20.00 Час.
20.35 "Прыпынак па патрабаванню-2".
21.45 Чалавек і закон.
22.30 Начны "Час".
23.00 Формула ўлады. Кароль Швецыі.
23.30 "Начная змена".

РАСІЯ

8.00, 10.00, 16.00, 19.00 Весткі.
8.15, 18.00 "Агенцтва НЛС".
9.05 Сам сабе рэжысёр.
10.30 "Санта-Барбара".
16.30 Фільм "Звальненне на беразе".
19.35, 22.30 Мясцовы час. Весткі-Масква.
19.55 Фільм "Аляксандр Салжаніцын. Жыццё не па хлусні".
20.55 Фільм "Міхаіл Гарбачоў. Сёння, праз дзесяць гадоў".
22.00 Весткі + Падрабязнасці.
22.45 Камедыя "Сустрэнемся на Таіці".
0.25 Гарачая дзесятка.
1.20 Прагноз надвор'я.

КУЛЬТУРА

7.05, 11.30, 15.00, 17.30, 23.00 Навіны культуры.
7.30, 20.00 "Парасон для маладых". Маст. фільм.
8.55 Яўген Баратынскі.
9.15 "Рамантыка раманса".
9.40, 15.35 "Меч іслама". Дак. фільм. 1-я серыя.
10.35 Астравы.
11.45 "Легенды дзікай Поўначы".
13.30 Разам з Фафалем.
13.45 "Шчаўкунчык".
14.15 Чым жыве Расія.
14.30 "Сам-насам са словам".
15.10 "Гатовыя ці не".
16.30 "Вандроўкі музыканта".
17.00 Археалогія.
17.50 Арт-панарама.
18.15 "Штокінгер".
19.00 М. Равель. Вальс.
19.15 "Сам-насам з Пятром Вялікім".
19.45 Добрай ночы, малышы!
21.35 Культурная рэвалюцыя.
22.30 "Джазафрэнія."

НТБ

5.00, 5.30, 6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00, 23.00 Сёння.
5.15, 6.20, 14.40, 17.40 Крымінал.
5.20, 7.15 У запас.
5.35, 6.40, 14.30 Афіша.
5.40, 7.25 Нашы любімыя жывёлы.
5.45, 6.456 7.45 Пяць хвілін з Наважонавым.
5.50, 6.50 Вялікія грошы.
6.35, 7.40 Карданны вал.
7.55 "Хуткая дапамога".
9.25 Сквапнасць.
10.10 Дог-шоу "Я і мой сабака".
11.25 "Паліцэйскія".
13.20 Ток-шоу "Прынцып "Даміно".
15.30 "Графіня дэ Мансаро".
16.30, 18.50 "Растоў-тата".
18.30 Герой дня.
20.00 Увага. Пошук!
21.55 Зусім сакрэтна.
23.25 Гардон.

СТБ

6.00, 16.30 "Ікс-мэн".
6.30, 16.00 "Шкадлівы сабака".
7.00 "Шалёны Джэк-пірат".
7.30, 15.30 "Мурашкі".
8.00, 18.15 Міжнародныя спартыўныя навіны на СТБ.
8.15 Навіны СНД.
8.30, 18.45 "Аўтапанарама".
8.45, 19.10 "Прэм'ер-парад "Сталічны".
8.50, 23.30 "Віртуальны свет".
9.00 Меладрама "Зорачка мая ненаглядная".
11.30 "Еўропа сёння".
12.00, 15.0, 18.00 Навіны СТБ.
12.15 "Выпадковы сведка".
12.45 "Медыкі".
14.00 "Сімулятар".
15.15, 1.50 "М 1".
16.55 "Чарцяня".
18.30 Цэнтр забаў "Мэдзісон авеню".
19.00 "Тэма дня". Вынікі ў уікэнд".
19.16 "Вечарніца".
19.30 Баявік "Нейтронная бомба і сем гномаў".
21.45 "Сакрэтныя матэрыялы".
23.00 Навіны "СТБ-24 гадзіны".
23.45 Драма "Дзяўчынка Ніхто".

ТБ 6

5.45, 14.40, 17.40, 1.05 Дарожны патруль.
6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 12.00, 14.00, 16.00, 18.00, 20.00 Цяпер.
6.10, 6.40, 7.10 Дзень за днём.
7.40, 20.35 Тушыце святло.
7.50 Назло.
8.25, 20.50 Фільм "Страсці па Нобелю".
9.15, 12.20, 14.25 Тэлемагазін у Мінску.
9.25 "Без гальштука".
10.20 "Жанчына з характарам".
11.30 Катастрофы тыдня.
13.20 "Самыя гучныя злачынствы XX стагоддзя".
15.00 100 цудаў свету. "У пошуках Аточы".
16.30, 18.50 "Вуліцы разбітых ліхтароў III".
22.00 Грані.
22.45 "Без пратакола".

ПЯТНІЦА, 14 СНЕЖНЯ
БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 0.05 Навіны.
6.10, 7.10, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
9.10, 17.00 «Брыгады Тыгра».
10.05 Сад мары.
10.30, 15.40 «Маленькія Эйнштэйны».
11.00, 21.45 «Сямейныя вузы».
12.15 Добры дзень, Беларусь!
13.05 «Строгавы». Маст. фільм. 4-я серыя.
14.15 «Скарбы сусветнай культуры».
14.30 Відэафільм «Дзелавыя людзі».
15.15 «Дзні, раскажы мне гісторыю».
15.25 «Казкі бацькі Кастара-2».
16.10 «Пяць цудаў». 16.20 «5 х 5».
18.25 Зона Ікс.
18.35 Парламенцкі веснік.
19.05 Маст. фільм «Чырвонае лісце».
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
22.35 Спорт-кур'ер.
22.45 Дэтэктыўны серыял «Атрад па барацьбе з мафіяй».
0.20 Беларуская дваццатка.
0.45 Цяжкая атлетыка. Міжнародны турнір памяці заслужанага майстра спорту Е. Новікава.

ГРТ

8.00, 11.0, 14.00, 17.00 Навіны.
8.15, 18.00 «Зямля кахання».
9.10 «Самі з вусамі».
9.40 «Слабое звяно».
10.35 «Бесталковыя нататкі».
10.50 Бібліяманія.
15.00, 20.35 «Прыпынак па патрабаванню-2».
16.00 Вялікае мыццё.
17.25 Дак. дэтэктыў «Мішэнь для дэзерціра». Справа 2001 года.
19.00 Поле цудаў.
20.00 Час.
21.45 Серыял «X-files».
22.35 «Іншы час».
23.30 Фільм «Пястун лёсу».

РАСІЯ

8.00, 10.00, 16.00, 19.00 Весткі.
8.15, 18.00 «Агенцтва НЛС».
9.10 Новая «Старая кватэра».
10.30 «Санта-Барбара».
16.30 Планета КВЗ.
17.00 Прэс-клуб.
19.35 Мясцовы час.
19.55 Фільм «Вочы чорныя».
22.45 Фільм «Распуснік».
0.45 Рэальнае кіно. Цырымонія ўручэння прэміі «Лаўровая галінка».

КУЛЬТУРА

7.05, 11.30, 15.00, 17.30, 23.00 Навіны культуры.
7.30, 20.40 «Непадсудны». Маст. фільм.
8.50 «Аграбленне па...» Мультфільм.
9.10 М. Брух. Канцэрт для скрыпкі з аркестрам.
9.40, 15.35 «Меч іслама». Дак. фільм. 2-я серыя.
10.35 «Запозненае каханне».
11.45 «Легенды дзікай Поўначы».
13.15 «Ах, ужо гэтыя дзеткі». Мультфільм.
13.30 Разам з Фафалем.
13.45 «Шчаўкунчык».
14.15 Чым жыве Расія.
14.30 Музычныя дамы.
15.10 «Гатовы ці не».
16.30 Сенсацыя. Сансацыя? Сенсацыя...
17.00 Археалогія.
17.50 «Хто там...».
18.15 «Штокінгэр».
19.00 Р. Шуман. «Новелета».
19.15 «Сам на сам з Пятром Вялікім».
19.45 Добрай ночы, малышы!
20.00 «Царская ложа».
22.00 Фантазія на тэмы адыходзячага стагоддзя.
22.30 А. Геніс. Пісьмы з Амерыкі.

НТБ

5.00, 5.30, 6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.0, 21.00 Сёння.
5.15, 6.20, 14.35, 17.30 Крымінал.
5.20, 7.15 У запас.
5.35, 6.40, 14.30 Афіша.
5.40, 7.25 Нашы любімыя жывёлы.
5.45, 6.45, 7.45 Пяць хвілін з Наважонавым.
5.50, 6.50 Вялікія грошы.
6.35, 7.40 Карданны вал.
7.55 Вочная стаўка.
8.25 Падарожжы натураліста.
9.25 Свая гульня.
10.10 Увага. Вышук!
11.25 «Паліцэйскія».
13.25 «Працяг будзе...».
15.30 Прафесія — рэпарцёр.
15.45 Прыгодніцкі фільм «Двайны абгон».
18.35 Свабода слова.
20.10 Крымінальная Расія.
21.50 Баявік «Лішняя сіла».
23.40 Пепсі — чарт.
0.20 Кома.

СТБ

6.00, 16.30 «Ікс-мэн».
6.30, 16.00 «Шкадлівы сабака».
7.00, 15.30 «Фантастычная чацвёрка».
7.30 «Прынцэса Сісі».
8.00, 18.15 Міжнародныя спартыўныя навіны на СТБ.
8.15 Навіны СНД.
8.30 «Сняданак з Лікай».
8.35 Музыка на СТБ.
8.45, 19.10 «Прэм'ер-парад «Сталічны».
8.50, 23.30 «Віртуальны свет».
9.00 Меладрама «Зорачка мая ненаглядная».
11.30 «Еўропа сёння».
12.00, 15.0, 18.00 Навіны СТБ.
12.15 «Выпадковы сведка».
12.45 «Медыкі».
14.00 «Сімулятар».
15.15, 1.50 «М 1».
16.55 «Чарцяня».
18.30 Цэнтр забаў «Мэдзісон авеню».
19.00 «Тэма дня». Вынікі ў уікэнд».
19.16 «Вечарніца».
19.30 Баявік «Нейтронная бомба і сем гномаў».
21.45 «Сакрэтныя матэрыялы».
23.00 Навіны «СТБ-24 гадзіны».
23.45 Драма «Дзяўчынка Ніхто».

ТБ 6

5.45, 14.40, 17.40, 1.05 Дарожны патруль.
6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 12.00, 14.00, 16.00, 18.00 Цяпер.
6.10, 6.40, 7.10 Дзень за днём.
7.40 Тушыце святло.
7.50 Назло.
8.25, 21.20 Фільм «Страсці па Нобелю».
9.25 «Маё кіно».
10.20 «Жанчына з характарам».
11.30 «За мяжой магчымага».
12.20, 14.25 Тэлемагазін у Мінску.
13.20 «Самыя гучныя злачынствы XX стагоддзя».
15.00 100 цудаў свету. «Дзікая прырода Панамы».
16.35, 18.45 «Вуліцы разбітых ліхтароў III».
20.00 «Голас народа».
22.30 Межы.
23.00 «Сведка стагоддзя».
23.20 Баявік «Ахвярапрынашэнне».

СУБОТА, 15 СНЕЖНЯ
БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

7.00, 9.00, 15.00, 19.00 Навіны.
7.10 «Жанчына ў белым».
8.10 «Вялікія жанчыны стагоддзя». Фільм «Джэйн Фонда».
8.30 Існасць.
9.10 Экран індыйскага кіно. «Нявыкрадзеная нявеста».
12.25 Сад мары.
12.50 Каралеўскае паляванне.
13.15 Здароўе.
13.40 «Растоў-бацька».
14.35 Сталіца.
15.15 «Атрад па барацьбе з мафіяй».
16.35 Беларуская дваццатка.
17.00 Пяць цудаў.
17.30 Чароўная шкатулка «Саюзмультфільма».
18.15 Відэафільм «Хто там...».
18.35 З дакладных крыніц.
19.20 «На перакрыжаваннях Еўропы». Тэлефестываль беларускай песні.
20.10 «VIP».
21.00 Панарама.
21.50 Спорт-кур'ер.
22.00 Трагікамедыя «Асноўныя колеры».
0.20 Відзьма-нявідзьма.
1.30 «Каралева мячоў».

ГРТ

7.00, 9.00, 14.00, 17.00 Навіны.
7.10 Мультфільм «Карлсан вярнуўся».
7.30 Слова пастыра.
7.45 «Кліч джунгляў».
8.10 «Эх, Сямёнаўна!».
8.50 Бібліяманія.
9.10 Смехапанарама.
9.45 Смак.
10.05 40 гадоў жартуючы. КВЗ. Фрагменты біяграфіі.
11.00 У свеце жывёлы.
11.40 Здароўе.
12.20 «Сярэбраны шар». Людміла Цалікоўская.
13.00 Тайны забытых перамог. «Уральскі дракон».
13.30 «Усё пра Мікі Мауса».
14.10 Камедыя «Самая абаяльная і прывабная».
15.45 Песня года. Зіма.
17.20 Канцэрт «Яўгеній Петрасян запрашае...».
18.00 «Хто хоча стаць мільянерам?».
19.00 Апошні герой. «Анархія дыктатуры».
20.00 Час.
20.30 Што? Дзе? Калі?
21.40 Баявік «Вочы змяі».
23.35 Камедыя «Жыць, як каралі».

РАСІЯ

7.00 Тата, мама, я — спартыўная сям'я.
7.45 «Тэлепузікі».
8.10 Залаты ключ.
8.30 Здароўе і жыццё.
9.00 Пошта РТР.
9.30 Добрай раніцы, краіна.
10.10 Сто да аднаго.
11.00 Ток-шоу «Побач з табой».
11.55 «Тайны агент».
13.00, 19.00 Весткі.
13.20 Камедыя «Зямля Санникава».
15.00 Ала Пугачова. «Успаміначы Калядны».
17.00 Мая сям'я.
17.55 Аншлаг.
19.25 Люстэрка.
20.00 Фільм «Стомленыя сонцам».
22.55 Фільм «Ніколі не размаўляй з незнаёмцамі».

КУЛЬТУРА

9.10 Мультфільмы.
9.60 Вуглы манежа.
10.15 Бабуліны рэцэпты.
10.30 Залаты п'едэстал.
11.00 Графаман.
11.25 Цуды надвор'я.
11.50 «Дзесьці ёсць сын». Маст фільм.
13.05 «Жылі-былі».
13.30, 21.00 Навіны культуры.
13.45 «Час музыкі».
14.10 «Кот у ботах».
14.35 Дак. серыял «Музыка свята».
15.30 «Брошка». Тэлеспектакль.
16.30 «Вакзал мары».
17.05 «Майскія кветкі».
18.00 Сферы.
18.40 XX стагоддзе. Выбранае.
19.30 «Гістарычныя канцэрты».
20.15 Дом акцёра.
21.20 Асабістыя ўспаміны пра вялікае жыццё.
21.25 «Чунгкінгскі экспрэс». Маст. фільм.

НТБ

5.35 Прыгодніцкі фільм «Двайны абгон».
7.00, 9.00, 11.00, 15.00, 21.00 Сёння.
7.15 «Вуліцам Сезам».
7.35 Мультфільм «Тры мядзведзі».
7.45 Вялікія бацькі.
8.20 Без рэцэпта.
9.15 Крымінал.
9.50 «Жаночы погляд».
10.25 Кватэрнае пытанне.
11.25 Фільм «Небяспечныя сябры».
13.25 Падарожжа натураліста.
14.00 Свая гульня.
15.25 «Працяг будзе...».
16.15 Шоу Алены Сцепаненка.
17.10 Дэтэктыў «Забіць «шакала».
18.45 Фільм «Замест мяне».
21.30 Прафесія — рэпарцёр.
22.10 Баявік «Гульня на выжыванне».
0.10 Цырымонія ўручэння прэміі «Тавар года».
1.15 Колер ночы.

СТБ

6.00 Музканал.
7.00 «Паралелі».
7.15 «У гасцях у Тофіка».
7.30 «Інспектар Гаджэт».
8.00 «Дыпладокі.
8.30, 9.00 «Футурама».
9.30 «Бафі».
10.30 Баявік «Нейтронная бомба і сем гномаў».
12.50 «Экзотыка».
13.05 «Перакрыжаванне».
13.30 Гістарычны фільм «Емяльян Пугачоў». 1-я серыя.
15.20 «Прывітанне, доктар».
15.35 «Хто я...».
16.00, 16.30 «Чалавек-павук».
16.50 «Дальнабойшчыкі».
18.00 Маст. фільм.
19.30 «Гадзіна пік».
20.30 «Прэм'ер-парад «Сталічны».
20.55 Баявік «Шаша 666».
23.05 «Сімулятар».
0.05 Цэнтр забаў «Мэдысан авеню».
0.35 «Радыёкропка».
0.55 «М 1».

ТБ 6

6.05, 13.35, 23.45 Дарожны патруль.